УЛ. ФРУНЗЕ 10 КВ. ТУТ
СОВ. СТРОИТ. И ПРАВА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 93 (5767) | 22 красавіка 1937 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

АБ ЛЕНІНЕ — Прамова тав. **Сталіна** на вечары крэмлёўскіх курсантаў 28 студзеня 1924 г.

У ЛЕНІНА МЫ ВУЧЫМСЯ ПРАЦАВАЦЬ: **Бубяч** — Вучэнне Леніна бессмяротна; **Мінкін** — Геній Леніна вызначыў наша прыгожае сёння; **Кадушэвіч** — Яго творы вучаць нас.

ЛЕНІН — Верш **Наіры Зар'ян.**

В. М. Молатаў — Нашы задачы ў барацьбе з трацкісцкімі і іншымі шкоднікамі, дыверсантамі і шпіёнамі.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Свяшчэнны абавязак комуніста.

Прывітанне мадрыдскай канферэнцыі комуністычнай партыі Іспаніі маскоўскаму камітэту комуністычнай партыі большэвікоў.

Адказ маскоўскага камітэта усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў) мадрыдскаму камітэту комуністычнай партыі Іспаніі.

ЗА РУБЯЖОМ:

Трацкісты выключаны з соцыялістычнай партыі;

Пасяджэнне французскага кабінета;

Прыём у Парыжы ў гонар совецкіх скрыпачоў;

На франтах у Іспаніі.

СВЯШЧЭННЫ АБАВЯЗАК КОМУНІСТА

Шкодніцкая дзейнасць япона-нямецка-трацкісцкіх агентаў нанесла, як вядома, нямалую страту нашай народнай гаспадарцы. Маскіруючыся лічынай гарачых прыхільнікаў совецкай улады, прыкідваючыся комуністамі, пралезшыя ў партыю ворагі народу займалі адказныя пасады і наносілі ўдар за ўдарам рашаючым галінам соцыялістычнай індустрыі, будаўніцтва, транспарту.

У артыкуле, апублікаваным у апошнім нумары журнала «Большэвік» (другі раздзел артыкула* друкуецца сёння ў «Правде»), таварыш Молатаў дае вычэрпваючую характарыстыку тых подлых метадаў, да якіх прыбягалі трацкісцкія, бухарынскія і іншыя агенты фашызма. Яны прыводзілі ў нягоднасць механізмы, рабілі аварыі, выбухі, абвалы, крушэнні, пажары. Яны прабавалі падарваць нашу гаспадарку шляхам замаруджвання ходу важнейшых будоўляў, якія маюць першаступеннае абароннае і гаспадарчае значэнне, шляхам стварэння вострых дыспрапорцый у гасцадарцы, выпускам браку, зрывам стаханаўскага руху, наглымі спробамі сеяць азлабленне супроць совецкай улады сярод працоўных.

Выкрыццё шкодніцтва трацкісцкіх і бухарынскіх дыверсантаў і шпіёнаў выявіла буйнейшыя недахопы кіраўніцтва, якія мы абавязаны перамагчы ў найкарацейшыя тэрміны. Асноўнай умовай нашага руху наперад з'яўляецца чэсная і бязліцасная крытыка тых нашых недахопаў, якія выкарыстаны ворагамі. «Кіраўнікі абавязаны, прынамсі цяпер, калі многія факты ўжо ўскрыты, растлумачыць сваім работнікам, дзе яны памыліліся, хто дапусціў гэтыя ўпушчэнні, чаму адбыліся гэтыя факты» (Молатаў). Толькі сур'ёзны добрасумленны аналіз недахопаў можа папярэдзіць новыя правалы, можа выхаваць кадры, расшырыць палітычны кругазор людзей.

Гэта азбучнае палажэнне, на жаль, усвядомлена пакуль яшчэ далёка не ўсімі кіраўнікамі. Выступаючы на сходах актыва, многія начальнікі глаўкаў і кіраўнікі трастамі скрываюць перад сваімі работнікамі памылкі кіраўніцтва. На многіх прадпрыемствах яшчэ ў ходу палітычна шкодная, гнілая тэорыя аб тым, быццам аварыі з'яўляюцца немінучым злом, арганічна звязаным з усякім складаным тэхнічным працэсам. А некаторыя вельмі кваліфікаваныя і вопытныя работнікі, якім даручаюць расследаванне шкодніцкіх спраў, прыходзяць да зусім дзяліцкіх, павярхоўных вываадаў, праяўляючы і цяпер яшчэ непярпімую палітычную блізарукасць, няўменне распазнаваць ворага, нядольнасць выкрываць яго.

Многія гора-кіраўнікі схільны безупынна балбатаць аб пільнасці, а калі справа даходзіць да неабходнасці палітычнага выхавання сваіх работнікаў на канкрэтных памылках, яны робяць усё для затушоўвання недахопаў, для выратавання «гонару» яўна патрапанага ведамственага мундзіра.

Тры асноўныя задачы, намечаныя ў артыкуле тав. Молатава, неабходна вырашыць зараз для кардыннага паляпшэння гаспадарчага кіраўніцтва: першая задача — палітычнае выхаванне кадраў, другая — большэвіцкі падбор работнікаў, трэцяя — выкарчоўванне да канца кампылярска-бюракратычных метадаў кіраўніцтва і большэвіцкая арганізацыя гаспадарча-вытворчых актываў.

Важнейшы ўрок, які вынікае з шкодніцтва трацкістаў і іх саўдзельнікаў — правых рэстаўратараў капіталізма — заключаецца ў тым, што нашы кадры павінны не толькі дасканала валодаць тэхнікай, але і дасканала авалодаць большэвізмам. А авалодаць большэвізмам — гэта значыць перш за ўсё перамагчы палітычную блізарукасць, навучыцца правільна ацэньваць людзей, падняць пільнасць, навучыцца распазнаваць ворага, не глядзячы на самую хітрую маскіроўку.

Палітычна выхоўваючы нашы кадры, мы абавязаны развіваць у іх здольнасць да самакрытыкі, вытручаць сапоўна-высокамернае зазнайства. Гаспадарнік-большэвік павінен з усёй палкасцю змагацца за чэсныя адносіны да дзяржавы, за рашучае выкараненне трапежніцкіх, рвацкіх, дробнабуржуазных тэндэнцый, лагэтуль не знішчаных яшчэ ў некаторых нашых дзяржаўных прадпрыемствах і ўстановах.

Для паспяховай барацьбы са спробамі ворага пранікнуць на нашы прадпрыемствы патрэбна падняць адказнасць кіраўнікоў за падбор работнікаў. Няма ніякіх падстаў скардзіцца на недахват здольных і таленавітых людзей у нашай краіне, на недахват кадраў, якія гараць жаданнем працаваць, вучыцца і расці. Людзьмі мы багаты. Справа, стала быць, толькі за іх умелым падборам.

Прамы абавязак партыйных кіраўнікоў — смела высоўваць на кіруючую работу новыя маладыя кадры, палітычна праверэных, чэсных людзей, ведаючых, падрыхтаваных і любячых справу. «Крытэрыем у падборы работнікаў, — гаворыць тав. Молатаў, — павінны быць як іх дзелавыя, так і іх палітычныя якасці, аб якіх кіраўнік павінен ведаць, — ведаць не па чутках і не па паперках, а ўсур'ёз, на аснове штодзённага нагляду за работай і на аснове пастаяннай праверкі работы гэтых людзей».

Нарэшце, важнейшы вывад з выкрыцця шкодніцтва заключаецца ў неабходнасці больш уважліва прыслухоўвацца да голасу мас, да крытыкі мас, шырэй выкарыстаць велізарны вопыт працоўных. Траба пакончыць са скажэннем прынцыпу азнаначалля, са спробамі некаторых кіраўнікоў вызваліцца ад крытыкі і кантролю мас. Дрэнны той камандзір вытворчасці, які не ўмее бачыць сваю работу тысячамі вачэй рабочых, не ўмее раіцца з актывам. Парочным метадам сваёй работы такі кіраўнік сам адкрывае ворагу шматлікія шчыліны.

Творачы злачынствы, шкоднікі выкарыстоўвалі адсутнасць строгага парадку на прадпрыемствах, адсутнасць праверкі выканання і бесклапотныя адносіны кіраўнікоў да рэалізацыі раней прынятых рашэнняў. Наш прамы абавязак рашуча пакончыць з сістэмай безадказнасці. Неабходна на кожным прадпрыемстве, у кождай установе ўвесці цвёрды і непахісны рэжым работы, парушэнне якога павінна найстражэй карацца. Неабходна, нарэшце, навучыцца праверцы выканання раней прынятых рашэнняў і распаладжэнняў, прывіць гаспадарнікам уменне працаваць, апіраючыся на актыў, на крытыку і падтрымане мас.

Пасля Пленума ЦК прайшло ўжо нямала часу. Аднак вынікі шкодніцтва ліквідуюцца пакуль архімарудна і незавальняюча. Некаторыя начальнікі галоўных кіраўніцтваў Наркамцяжпрома і іншых гаспадарчых наркаматаў яўна замяшаліся. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, становішча справы ў вугальнай, у хімічнай, у меднай прамысловасці. З другога боку, і партыйныя арганізацыі—Данецкі абком партыі ў першую чаргу — адсунулі на задні план пытанні гаспадаркі. Пленум Данецкага абкома, які адбыўся 18 красавіка, вымушан быў прызнаць незавальняючай работу бюро абкома, гаркомаў і райкомаў партыі па выкананню рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна, прызнаць, што партыйныя арганізацыі Данбаса не змаглі спалучыць максімальнае ўзмацненне партыйна-палітычнай работы з узмацненнем работы па кіраўніцтву гаспадаркай. Ці патрэбна больш шырока растлумачваць усю недапушчальнасць падобнага становішча?

«Выкрыццё і выгнанне ворага з дзейнічаючай арміі будаўнікоў соцыялізма, — піша тав. Молатаў, — узмацненне нашай арміі, узлым яе сіл — гарантыя новых поспехаў. Таму кожны з нас павінен памятаць аб свяшчэнным абавязку комуніста, развіваць сваю большэвіцкую зоркасць, узнімаць большэвіцкую свядомасць кадраў. Галоўнае цяпер залежыць ад нас—большэвікоў. Наколькі мы, большэвікі зразумеем свае задачы і зробім патрэбныя вывады, большэвіцкія вывады,—настолькі паскорыцца наш рух наперад».

(„Правда")

*) Гл. 3 і 4 стар. «Звязды».

АРГАНІЗУЕМ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА НА ЛЕПШУЮ СУСТРЭЧУ ПЕРШАГА МАЯ

ПРЫКЛАД ЧЫРВОНААРМЕЙЦА ЗАЙЦАВА

У калгасе імя Кірава, Варатынскага сельсовета, Бабруйскага раёна, гэтымі днямі да калгасніка Пятра Зайцава прыехаў на пабыўку яго сын, чырвонаармеец-танкіст Якаў Зайцаў. Будучы дома, Якаў рашыў папрацаваць на трактары. Ён папрасіў у аднаго з трактарных атрадаў Цялушскай МТС даць яму магчымасць ажыццявіць сваю мару.

19 красавіка, працуючы на трактары «ЧТЗ» васьміляменным плугам, тав. Зайцаў за начную змену ўзараў 21 гектар (норма 12 гектараў). Якасць ворыва добрая.

Калгаснікі захапляюцца работай энтузіяста-чырвонаармейца Якава Пятровіча Зайцава.

П. ПАТАПЕЙКА.

ПЕРАВЫКОНВАЮЦЬ НОРМУ Ў ДВА РАЗЫ

Калі жаночая трактарная брыгада (брыгадзір Цвірка) Старадарожскай МТС выехала на поле калгаса «10-годзе Кастрычніка», некаторыя адсталыя калгаснікі проста заяўлялі:

— Хіба жанчыне справіцца з такой машынай?... Поле толькі нам папсуюць.

Малалыя трактарысткі — удзельніцы Усебеларускай нарады дзяўчат-трактарыстак Чака Яўгенія, Коўцяк Марфа, Баброўнік Ольга і Калтун Таццяна не зважалі на гэтыя размовы. Яны былі ўпэўнены ў сваіх сілах і спадзяваліся, што праз некалькі дзён калгаснікі будуць задаволены іх работай. 4 красавіка трактары прыступілі да работы. За рулём сядзелі малалыя, нядаўна скончыўшыя курсы трактарыстак. Да іх работы пільна прыглядаліся калгаснікі і прыходзілі да аднаго вываду: арэць добра.

У начную змену з 8 на 9 красавіка трактарыстка Фака Яўгенія амаль удвая перакрыла норму выпрацоўкі; замест нормы ў 4 гектары яна ўзарала 7,93 гектара. Неўзабаве на поле прыехаў трактар МТС і тут-жа перадаў ёй 50 руб. прэміі. Гэта падбадзёрыла трактарыстак.

Следам за Яўгеніяй нормы ўдвая і больш пачалі перакрываць і трактарысткі Баброўнік Вольга і Колтун Таццяна. Яны ўзорваюць за змену па 8,5 гектара. У жаночай трактарнай брыгадзе шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва.

Н. ВІШНЕЎСКІ.

СКОНЧЫЛІ СЯЎБУ ЗЕРНАВЫХ

Соўгас «Уваравічы» (дырэктар т. Скроб) скончыў сяўбу зернавых. Усяго пасеяна: аўса 89 гектараў, ячменю 55, пшаніцы 15, вікі на зярно 35.

Сяўба праведзена з захаваннем усіх агратэхнічных правілаў. Апрацоўка глебы высокаякасная.

ГАСМАН.

СПАБОРНІЦТВА СТАХАНАЎСКІХ ЗВЕННЯЎ

138 стаханаўскіх звенняў арганізаваны і працуюць на палях Гроскага раёна. Звенні калгасаў змагаюцца за рэкорды ўраджай.

Звяно стаханаўкі калгаса імя Кірава, Мусіцкага сельсовета, Вольгі Кіршчыні абавязалася атрымаць з гектара 10 цэнтнераў ільновалакна. Перад пасевам праведзена пружынаванне глебы ў два сляды, унесена мінеральнае ўгнаенне; фасфарытная мука з хлорыстым каліем, а таксама курыны памёт. Пасля гэтага звяно зрабіла падсеў попелам і штучным памётам. Ільносемя перад сяўбой было пратушчана праз трашчотку і трыумф.

Звяно калгасніка Каспюка Івана збавязалася атрымаць 600 цэнтнераў бульбы з гектара. Перад сяўбой бульбы праведзен пасеў мінеральных угнаенняў—фасфарытнай мукі і сільвініта. У два сляды было праведзена пружынаванне, перавор-ванне і бараванне. У якасці падкормкі будзе скарыстана гноевая жыжа.

40 цэнтнераў ячменю з гектара абавязалася атрымаць звяно Мяцельскага Сяргея, 65-гадовы калгаснік калгаса «Вясёлае жыццё». Прусакоўскага сельсовета, Кузьмін Пятро арганізаваў стаханаўскае звяно па барацьбе за рэкорды ўраджай бульбы. Сяўба бульбы праведзена звяном з прымяненнем усіх правіл агратэхнікі.

Е. РЫКЛІН.

ПОСПЕХІ КРЫВАНОСАЎЦАЎ

У Менскім паравозным дэпо група машыністаў - крываносаўцаў рыхтуе дастойную сустрэчу Першаму мая. Машыніст Караткоў 21 красавіка правёў таварны поезд з Барысава ў Менск з сярэдняй тэхнічнай хуткасцю 38,64 кілометра ў гадзіну. Машыніст Скваркоўскі з Менска ў Негарэлае правёў таварны поезд з сярэдняй тэхнічнай хуткасцю 52.6 кілометра ў гадзіну.

Токар паравознага дэпо, узнагароджаны значком «Ударніку сталінскага заліку», кандыдат партыі Яромка, працуючы на апрацоўцы паршнявых і залатніковых кольцаў і дышлавых падшыпнікаў, за 17 рабочых дзён красавіка выканаў свой план на 235 проц. Малады токар Кулінчык пры норме затраты 190 гадзін 1 47 мінут зрабіў дэталі за 112 гадзін.

СТРЭЛЬЧАНКА.

ТАРМОЗЯЦЬ СТАХАНАЎСКІ РУХ

Маблевая фабрыка «Праца» ў 1937 годзе перайшла ў ведамае Наркомлеса БССР. Пераход у новы наркамат нікольні не паляпшыў спраў фабрыкі. План як не выконваецца, так і да гэтага часу не выконваецца. За першы квартал фабрыка дала ўсяго 57 проц. плана, і гэта ў той час, калі сыравінай яна забяспечана поўнасцю.

У чым прычына дрэннай работы фабрыкі? У тым, што кіраўніцтва фабрыкі ігнарэе стаханаўскі рух, што бязлушна адносіцца да людзей, што ніякага тэхнічнага кіраўніцтва ў цэхах няма.

Абсталяванне на фабрыцы вельмі старое, належаўшае яшчэ былому фабрыканту Ліўшыцу. Многа варштатаў і агрэгатаў старога тыпу, зношаны і патрабуюць капітальнага рамонту. Яны вельмі небяспечны ў пажарных адносінах і ў тэхніцы безапаснасці. Нядаўна ў сушні выбухнуў пажар. Некаторыя рабочыя калечыліся з-за няспраўнасці варштатаў.

У сушыльным цэху адсутнічае выпяжная труба. Пыл і дым рассцілаюцца па цэху, а кіраўніцтва фабрыкі не звяртае на гэта ніякай увагі. Каб пусціць круглапільны варштат і надзець пас, неабходна спыніць усе агрэгаты. Тысячы кубаметраў сыравіны ідзе ў адкіды, бесканцтрольна разбазаравацца.

Дырэктар фабрыкі Шэх, тэхнікіраўнік Шулер і начальнік цэха Капялевіч не прыслухоўваюцца к голасу рабочых, глушаць малейшую ініцыятыву іх, ігнаруюць стаханаўскі рух. Прапановы стаханаўцаў Дзербава, Сабалеўскага, накіраваныя на палепшанне вытворчасці і ўмоў працы, асталіся нерэалізаванымі. Па віне начальніка цэха Капялевіча ў 1936 годзе выпушчана недобраякаснай прадукцыі больш чым на 10.000 рублёў.

Кіраўніцтва фабрыкі не любіць крытыкі. Лепшага стаханаўца тав. Сабалеўскага за крытыку зволілі з фабрыкі. Яны абвінавацілі яго ў... шкодніцтве і зрыве стаханаўскага руху. Вось ужо другі месяц, як Сабалеўскі ходзіць без работы. Справа дайшла да таго, што дырэктар Шэх забараніў яму купляць хлеб з фабрычнага ларка. Больш агідных здзекаў наўрад ці можна знайсці.

Начальнік цэха Капялевіч здзекуецца з рабочых. Ён зволіў без усякіх пад стаў стаханаўку Зубовіч. Рабочага Пташкіна Капялевіч выгнаў з цэха, прымяняючы пры гэтым фізічныя метады ўздзеяння, а на яго месца паставіў свайго сына.

Бяздушныя адносіны да людзей гэтым не вычэрпваюцца. Пяжарная стаханаўка Навіцкая павінна была паехаць у Чэрвень у кансультацыю. Яна папрасіла дырэкцыю дазволіць ёй пад'ехаць на фабрычнай аўтамашыне, але ў гэтым ёй было адмоўлена. Стаханаўка Карпека вярталася з больніцы. Па дарозе сустрэла фабрычную машыну, на якой ехаў тэхнічны кіраўнік фабрыкі Шулер. Тав. Карпека папрасіла падвезці яе, але і гэты чыноўнік адмовіў ёй.

Траба яшчэ дадаць, што адпушчэныя трэстам 6.000 рублёў на рамонт кватэр рабочых не скарыстаны, што зарплата рабочым выдаецца несвоечасова, а гэтыя грошы скарыстоўваюцца на куплю розных матэрыялаў для фабрыкі.

Ф. САКАЛОЎСКІ.

100 ТЫСЯЧ ПАР ДЗІЦЯЧЫХ САНДАЛЯЎ

Рабочы калектыў абутковай фабрыкі імя Тэльмана (Менск) сустракае Першае мая новымі вытворчымі поспехамі. За дзве дэкады красавіка фабрыка выканала план у колькасным азначэнні на 109,7 проц. і ў цэнасным — на 106,7. Дасягнуты поспехі і ў паляпшэнні якасці прадукцыі. Пры норме выпуску 92,6 проц. прадукцыі першага гатунку за дзве дэкады выпушчана 93,35 проц.

Узняў выпрацоўку цэх па вырабу сандаляў, які ўвесь час адставаў. За 20 дзён красавіка ён выканаў план у колькасным азначэнні на 109,6 проц. і цэнасным—на 108,7 проц. Цэх засвайвае новы від прадукцыі — дзіцячыя сандалі малых памераў. Да свята будзе выпушчана 1.000 пар.

Новых рэкордаў дабіліся асобныя стаханаўцы. Тав. Хает, працуючы на прадасе прымацавання каблукоў, узняў сваю выпрацоўку да 317 проц. нормы. Сярэдняе выкананне норм за дзве дэкады красавіка роўна 306,7 проц., супроць 250 проц. у сакавіку. Ад Хаета некалькі адстае, але наслядоўна павышае выпрацоўку спаборнічаючы з ім шнураўшчык Велічка. У сакавіку тав. Велічка выконваў норму на 200 проц., 18 красавіка ён даў 228 проц. нормы. Узнялі выпрацоўку таксама заняжчык бапінак Мірскі (171 проц.), памантыроўшчыца сандаляў Калейнік (388 проц.), допельшчыца Ефімовіч (110 проц.) і інш. Тав. Варабейчык, які на допельнай машыне ледзь выконваў норму, у апошнія дні дае 110—111 процантаў.

НОВЫ ЦЭХ

МАГІЛЁЎ. (Кар. «Звязды»). Падрыхтоўка к першамайскім святам на швейнай фабрыцы імя Валадарскага знамянуецца вялікай радаснай падзеяй. Уступіў у строй новы пашывачны цэх. У калектыў фабрыкі ўліўся новы атрад рабочых — 400 чалавек, якія будуць працаваць у светлым, прасторным, прыгожа абсталяваным корпусе.

З новых рабочых 120 чалавек прайшлі папярэднюю паўтарамесячную падрыхтоўку ў старых цэхах. Астатнія прыйшлі сюды з фабзавуча. Цяпер рабочы калектыў фабрыкі імя Валадарскага налічвае звыш двух тысяч чалавек.

Новы цэх будзе вырабляць розны асартымент шарсцянага і баваўнянага адзення для дарослых жанчын і дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту. Да канца гэтага года цэх павінен выпусціць прадукцыі на суму 1.600 тысяч рублёў.

За дзве дэкады красавіка фабрыка выканала промфінплан на 107,9 проц. За першую палову красавіка брыгада тав. Лейкіна выканала вытворчую праграму на 143 проц., 16 красавіка — на 165 проц., 17 і 18 — на 166 проц. Брыгада тав. Прыстаўкі ў першай палове красавіка выканала план на 125 проц., 16 красавіка —на 123 проц., 17 — на 128 проц., 18 — на 140 проц.

С. ГАЛКІН.

МАСКОЎСКАМУ КАМІТЭТУ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БОЛЬШЭВІКОЎ

МАСКВА — ТЭЛЕГРАМА З МАДРЫДА АД 11 КРАСАВІКА Г. Г.

Мадрыдская канферэнцыя комуністычнай партыі Іспаніі, сабраўшыся сёння ў гераічнай сталіцы Іспанскай рэспублікі для аналізу становішча, якое мы маем у рэзультаце васьмімесячнай вайны і ў рэзультаце пяцімесячнай абароны Мадрыда, па-брацку вітае комуністаў сталіцы СССР, партыю большэвікоў Совецкага Саюза і любімага правадыра ўсіх працоўных і антыфашыстаў усяго свету — таварыша **Сталіна.**

Наша прывітанне — гэта падзяка Мадрыда і іспанскага народу ўсім народам СССР за актыўную салідарнасць, якую да нас праявіла радзіма пролетарыята з першага моманту ўдару міжнароднага фашызма, які жадае ператварыць Іспанію ў калонію.

Канферэнцыя комуністаў Мадрыда абяцае вам следаваць па шляху пераможнага вопыту, які вы завяшчалі ўсім народам, што змагаюцца за сваю незалежнасць, за сваю свабоду і за прагрэс, і не супакоіцца да таго часу, пакуль мы не дабіемся поўнага вызвалення нашай радзімы ад панавання іспанскага і міжнароднага фашызма.

Няхай жыве маскоўская арганізацыя большэвікоў!

Няхай жыве комуністычная партыя Совецкага Саюза!

Няхай жыве любімы правадыр пролетарыята таварыш **Сталін!**

МАДРЫДСКАМУ КАМІТЭТУ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ІСПАНІІ

Дарагія таварышы!

З пачуццём глыбокай радасці мы прачыталі ваша брацкае прывітанне. Маскоўскія большэвікі, усе працоўныя сталіцы Совецкага Саюза —Масквы — захоплены гераічнай барацьбой свабоднага іспанскага народу супроць фашысцкіх варвараў — мяцежных банд Франко і нямецка-італьянскіх інтэрвентаў, якія нясуць з сабой галечу, голад і заняволенне працоўных Іспаніі.

Нашы мысці і пачуцці заўсёды з вамі, мужныя абаронцы Мадрыда.

Кожная ваша перамога глыбока радуе нас, радуе кожнага совецкага грамадзяніна, бо «вызваленне Іспаніі ад уціску фашысцкіх рэакцыянераў не ёсць прыватная справа іспанцаў, а агульная справа ўсяго перадавога і прагрэсіўнага чалавецтва» **(Сталін).**

Мы ўпэўнены ў вашай канчатковай перамозе. Крывавому фашызму і яго трацкісцкай агентуры не зламаць адзінства і волі іспанскага народу, які змагаецца за сваю незалежнасць, за свабодную дэмакратычную Іспанію.

Вышэй рэвалюцыйную дысцыпліну, мацней вінтоўку, нашы дарагія іспанскія таварышы!

Шлем вам наша брацкае комуністычнае прывітанне.

Няхай жывуць слаўныя абаронцы Мадрыда — гераічнай сталіцы іспанскай рэспублікі!

Няхай жыве гераічная компартыя Іспаніі!

Няхай жыве адзіны народны антыфашысцкі фронт!

Няхай жыве любімы правадыр совецкага пролетарыята таварыш **Сталін!**

Маскоўскі Камітэт Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў).

АБ НАЗНАЧЭННІ тав. КУЗНЯЦОВА Л. С. СТАРШЫНЕЮ КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ ФІЗКУЛЬТУРЫ І СПОРТА ПРЫ СНК БССР

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Совет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

Назначыць тав. Кузняцова Льва Саламонавіча старшынёю Камітэта па справах фізкультуры і спорта пры СНК БССР.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік спраў Совета Народных Камісараў БССР І. ЛУК'ЯНЧЫК.

г. Менск
20 красавіка.

ЗАВЕРШАН АРКТЫЧНЫ ПЕРАЛЁТ МАСКВА—ВОСТРАЎ РУДОЛЬФА

МЫС ЖЭЛАНІЯ, 19 красавіка. (БЕЛТА). Сёння, у 13 г. 35 м., лётчык Галавін вылецеў з Мыса Жэланія і адразу пайшоў курсам на поўнач па мерыдыяну в. Рудольфа.

***

ВОСТРАЎ РУДОЛЬФА, 19 красавіка. (БЕЛТА). Самалёт «СССР Н-166» у 17г. 05 м. удала прызямліўся на аэрадроме вострава. Шлях ад Мыса Жэланія да в. Рудольфа самалёт пакрыў за 3 г. 30 м. На поўдарозе самалёт сустрэў вялікі лобавы вецер.

Дасягнуўшы вострава Рудольфа, лётчык Галавін закончыў арктычны пералёт па маршруту Масква — Халмагоры —Нар'ян—Мар—Матачкін Шар — Мыс Жэланія — вострАў Рудольфа даўжынёю каля 4 тыс. кілометраў.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

Агляд ваенных дзеянняў

Наступленне рэспубліканцаў на арагонскім фронце працяўжаецца. Рэспубліканскія часці часткова перарэзалі камунікацыйныя лініі мяцежнікаў паміж Тэруэлем і Сарагосай, узарваўшы рад дарог і чыгуначных мастоў. Тэруэль з поўначы і паўночнага захада ахоплен кальцом рэспубліканскіх войск. Лоялдзкія ваенныя колы лічаць, што мяцежнікі наўрад ці ўтрымаюць Тэруэль. Павоцле апошніх вестак, уразаўшы войскі блізка падышлі да горада і з поўдня.

На паўночным фронце ініцыятыва, як і раней, знаходзіцца ў руках рэспубліканцаў. Войскі мяцежнікаў і інтэрвентаў прадпрынялі адчайныя намаганні, каб адбіць занятыя рэспубліканцамі за апошнія дні пазіцыі. Уразаўшы войскі аказваюць працяўніку гераічнае супраціўленне і наносяць яму вялікія страты. Мяцежнікам не ўдаецца прарваць лінію абароны і дабіцца рашаючага поспеху.

Як паведамляе агенцтва Гавас, у сектары Эйбар мела месца рукапашная схватка. Мяцежнікі вымушаны былі пакінуць пазіцыю Гараочы. У тым-жа сектары атрад рэспубліканскіх войск, скарыстаўшы начную цемру і гарыстую мясцовасць, падышоў да перадавых акопаў мяцежнікаў і закідаў іх гранатамі. Пры гэтым забіта 60 мяцежнікаў.

Урадавая артылерыя інтэнсіўна бамбардыравала галоўны горад Астурыі—Овіедо; бамбардыроўцы падпалі завод зброі, паўночны вакзал і казармы Пелайо.

У Більбао—галоўным горадзе баскскай аўтаномнай вобласці — пануе поўны спакой, паралак і дысцыпліна.

На паўднёвым фронце ваенныя дзеянні разгортваюцца спрыяюча для рэспубліканцаў. На фронце Карловы, на ўчастках Пасабланка і Вільяарта ідуць упартыя баі. Рэспубліканцы наступаюць, перамагаючы жорсткае супраціўленне ворага. Мяцежнікі перакінулі ў гэты раён буйныя падмацаванні і імкнуцца ўтрымаць важныя пазіцыі, якія пануюць над Ценьярой і Фуэнтэ-Овехуна.

На іншых франтах значных аперацый не было.

Арагонскі фронт

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 21 красавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас перадае паведамленне іспанскага ваеннага міністэрства, у якім гаворыцца, што на арагонскім фронце рэспубліканцы занялі вёску Селадас (за 18 кілометраў ад Тэруэля). Гэтаму папярэднічала моцная атака некалькіх рот рэспубліканцаў, дзеянні якіх падтрымлівалі палявая артылерыя і авіяцыя. Рэспубліканскія бамбардыроўшчыкі, суправаджаемыя знішчальнікамі, нечакана з'явіліся над тэрыторыяй мяцежнікаў і ўзмоцнена бамбардыравалі акопы і блокгаўзы мяцежнікаў.

Руйнуючае дзеянне бамбардыроўкі было велізарнае. Мяцежнікі, захваченыя знянацку, адступілі, а затым пусціліся ў беспарадку ўцякаць. Рэспубліканцы захапілі адну 155-міліметравую гармату, дзве 105-міліметравыя гарматы, чатыры 75-міліметравыя гарматы, адну процівацтанкавую і дзве зенітныя гарматы, а таксама 5 мартір, 14 кулямётаў і 300 тыс. патронаў. Лік палонных мяцежнікаў і перабежчыкаў дасягае 80.

Новая бамбардыроўка Мадрыда

МАДРЫД, 21 красавіка. (БЕЛТА). Учора мяцежнікі зноў падвергілі артылерыйскай бамбардыроўцы грамадзянскае насельніцтва Мадрыда. Бамбардыроўка пачалася ўжо ў 10 гадзін і дасягнула асобай сілы паміж 17 і 18 гадзінамі. Снарады падалі ў цэнтр горада і пры ўзрыве давалі шмат асколкаў. Лік афіяр яшчэ не ўстаноўлен.

ДА 67-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ В. І. ЛЕНІНА

АБ ЛЕНІНЕ

Прамова тав. СТАЛІНА на вечары крэмлёўскіх курсантаў 28 студзеня 1924 года

Таварышы! Мне сказалі, што ў вас тут наладжан вечар успамінаў аб Леніне, а я запрошан на вечар у якасці аднаго з дакладчыкаў. Я лічу, што няма неабходнасці праставіць звязны даклад аб дзейнасці Леніна. Я думаю, што было-б лепш абмежавацца паведамленнем раду фактаў, адзначаючых некаторыя асаблівасці Леніна як чалавека і як дзеяча. Паміж гэтымі фактамі, можа быць, і не будзе ўнутранай сувязі, але гэта не можа мець рашаючага значэння для таго, каб атрымаць агульнае ўяўленне аб Леніне. Ва ўсякім выпадку, я не маю магчымасці ў даным выпадку даць вам больш таго, што абяцаў вышэй.

Таварышы В. І. ЛЕНІН і І. В. СТАЛІН у Горках у 1922 г.

ГОРНЫ АРОЛ

Упершыню я пазнаёміўся з Леніным у 1903 годзе. Праўда, гэтае знаёмства было не асабістае, а завочнае, у парадку перапіскі. Але яно пакінула ва мне незглядзімае ўражанне, якое не пакідала мяне за ўвесь час маёй работы ў партыі. Я знаходзіўся тады ў Сібіры, у ссылцы. Знаёмства з рэвалюцыйнай дзейнасцю Леніна з канца 90-х гадоў і асабліва пасля 1901 года, пасля выдання «Искры», прывяло мяне да пераканання, што мы маем у асобе Леніна чалавека незвычайнага. Ён не быў тады ў маіх вачах простым кіраўніком партыі, ён быў яе фактычным творцам, бо ён адзін разумеў унутраную сутнасць і неадкладныя патрэбы нашай партыі. Калі я параўноўваў яго з астатнімі кіраўнікамі нашай партыі, мне ўвесь час здавалася, што саратнікі Леніна—Плеханаў, Мартаў, Аксельрод і іншыя—стаяць ніжэй Леніна цэлай галавой, што Ленін у параўнанні з імі не проста адзін з кіраўнікоў, а кіраўнік вышэйшага тыпу, горны арол, які не ведае страху ў барацьбе і смела вядзе ўперад партыю па невяведаных шляхах рускага рэвалюцыйнага руху. Гэтае ўражанне так глыбока запала мне ў душу, што я адчуў необходнасць напісаць аб ім адному свайму блізкаму другу, які знаходзіўся тады ў эміграцыі, патрабуючы ад яго водзыву. Праз некаторы час, будучы ўжо ў ссылцы ў Сібіры, — гэта было ў канцы 1903 г., — я атрымаў захапляючы адказ ад майго друга і простае, але глыбока змястоўнае пісьмо Леніна, якога, як аказалася, пазнаёміў мой друг з маім пісьмом. Пісьмяцо Леніна было параўнальна невялікае, але яно давала смелую, бястрашную крытыку практыкі нашай партыі і надзвычай яснае і сціслае ізложэнне ўсяго плана работы партыі на бліжэйшы перыяд. Толькі Ленін умеў пісаць аб самых заблытаных рэчах так проста і ясна, сціла і смела — калі кожная фраза не гаворыць, а страляе. Гэтае простае і смелае пісьмяцо яшчэ больш умацавала мяне ў тым, што мы маем у асобе Леніна горнага арла нашай партыі. Не магу сабе дараваць, што гэтае пісьмо Леніна, як і многія іншыя пісьмы, па прывычцы старога падпольшчыка, я спаліў.

З гэтага часу пачалося маё знаёмства з Леніным.

СКРОМНАСЦЬ

Упершыню я сустрэўся з Леніным у снежні 1905 года на канферэнцыі большэвікоў у Таммерфорсе (у Фінляндыі). Я спадзяваўся ўбачыць горнага арла нашай партыі, вялікага чалавека, вялікага не толькі палітычна, але, калі хочаце, і фізічна, бо Ленін рысаваўся ў маім уяўленні ў выглядзе велікана, статнага і прадстаўнічага. Якое-ж было маё расчараванне, калі я ўбачыў самага звычайнага чалавека, ніжэй скромнага росту, які нічым, літаральна нічым не адрозніваецца ад звычайных смертных...

Прынята, што «вялікі чалавек» звычайна павінен запазняцца на сходы, з тым, каб члены схода з заміраннем сэрца чакалі яго паяўлення, прычым перад паяўленнем вялікага чалавека члены схода папярэджваюць: «тсс... цішэй... ён ідзе». Гэтая абрадная здавалася мне не лішняй, бо яна імпануе, унушае павагу. Якое-ж было маё расчараванне, калі я даведаўся, што Ленін з'явіўся на сход раней делегатаў і, забіўшыся недзе ў кутку, па-прасценку вядзе гутарку, самую звычайную гутарку з самымі звычайнымі делегатамі канферэнцыі. Не скрыю, што гэта здалося мне тады некаторым парушэннем некаторых неабходных правіл.

Толькі пазней я зразумеў, што гэтая прастата і скромнасць Леніна, гэтае імкнанне астацца непрыкметным, або, ва ўсякім выпадку, не кідацца ў вочы і не падкрэсліваць сваё высокае становішча,— гэтая рыса прадстаўляе адну з самых сільных сторон Леніна, як повага правадыра новых мас, простых і звычайных мас найглыбейшых «цёмных» чалавецтва.

СІЛА ЛОГІКІ

Выпадкі былі дзве прамовы Леніна, якія ён сказаў на гэтай канферэнцыі: аб бягучым моманце і аб аграрным пытанні. Яны, на жаль, не захаваліся. Гэта былі натхнёныя прамовы, прыўзнёсшыя ў бурнае захапленне ўсю канферэнцыю. Незвычайная сіла пераканання, прастата і яснасць аргументацыі, кароткія і ўсім зразумелыя фразы, адсутнасць рысоўкі, адсутнасць галавакружэльных жэстаў і эфектных фраз, якія б'юць на ўражанне, — усё гэта выгадна адрознівала прамовы Леніна ад прамоў звычайных «парламенцкіх» аратараў.

Але мяне захапіў тады не гэты бок прамоў Леніна. Мяне захапіла тая непераадольная сіла логікі ў прамовах Леніна, якая некалькі суха, але затое грунтоўна авалодвае аўдыторыяй, паступова электрызуе яе і потым бярэ яе ў палон, як кажуць, без астатку. Я помню, як гаварылі тады многія з делегатаў: «Логіка ў прамовах Леніна — гэта нейкія ўсясільныя шчупальцы, якія захапляюць цябе з усіх бакоў кляшчамі і з аблыжкаў якіх няма моцы вырвацца: або здавайся, або рашайся на поўны правал».

Я думаю, што гэтая асаблівасць у прамовах Леніна з'яўляецца самай сільнай стараной яго аратарскага майстэрства.

БЕЗ ХНЫКАННЯ

Другі раз сустрэў я Леніна ў 1906 годзе на Стакгольмскім з'ездзе нашай партыі. Вядома, што на гэтым з'ездзе большэвікі аставіліся ў меншасці, папярэлі паражэнне. Я ўпершыню бачыў тады Леніна ў ролі пераможанага. Ён ні на ёту не быў падобен на тых правадыроў, якія хныкаюць і унываюць пасля паражэння. Наадварот, паражэнне ператварыла Леніна ў згустак энергіі, натхняючы сваіх стороннікаў к новым баям, к будучай перамозе. Я гаварыў аб паражэнні Леніна. Але якое гэта было паражэнне. Трэба было паглядзець на праціўнікаў Леніна, пераможнаў на Стакгольмскім з'ездзе — Плеханава, Аксельрода, Мартава і іншых: яны вельмі мала былі падобны на сапраўдных пераможцаў, бо Ленін у сваёй бязлітаснай крытыцы меншавізма не пакінуў на іх, як гаворыцца, жывога месца. Я помню, як мы, делегаты-большэвікі, збіўшыся ў кучу, глядзелі на Леніна, пытаючыся ў яго парады. У словах некаторых делегатаў сквазілі стомленасць, смутак. Помніцца, як Ленін у адказ на такія словы едка працадзіў праз зубы: «Не хныкайце, таварышы, мы наверняка пераможам, бо мы правы». Нянавісць да хныкаючых інтэлігентаў, вера ў сваё сілы, вера ў перамогу — вось аб чым гаварыў тады з намі Ленін. Адчувалася, што паражэнне большэвікоў з'яўляецца часовым, што большэвікі павінны перамагчы ў бліжэйшым будучым.

«Не хныкаць па выпадку паражэння» —гэта тая самая асаблівасць у дзейнасці Леніна, якая дапамагала яму згуртоўваць вакол сябе адданую да канца і веруючую ў свае сілы армію.

БЕЗ ФАНАБЭРЫІ

На наступным з'ездзе, у 1907 годзе, у Лондане, большэвікі аказаліся пераможанымі. Я ўпершыню бачыў тады Леніна ў ролі пераможца. Звычайна перамога кружыць галаву некаторым правадырам, робіць іх занослівымі і фанабэрыстымі. Часцей за ўсё ў такіх выпадках пачынаюць святкаваць перамогу, спачываць на лаўрах. Але Ленін ні на ёту не быў падобен на такіх правадыроў. Наадварот, іменна пасля перамогі становіўся ён асабліва пільным і настарожаным. Помніцца, як Ленін настойліва ўнушаў тады делегатам: «першая справа — не захапляцца перамогай і не фанабэрыцца; другая справа — замацаваць за сабой перамогу; трэцяя—дабіць праціўніка, бо ён толькі пабіт, але далёка яшчэ не дабіт». Ён едка высмейваў тых делегатаў, якія лёгкамысленна запэўнівалі, што «ад гэтага часу з меншавікамі пакончана». Яму не трудна было даказаць, што меншавікі ўсё яшчэ маюць карэнні ў рабочым руху, што з імі трэба весці барацьбу умеючы, усялякі пазбягаючы пераацэнкі сваіх сіл і, асабліва, недаацэнкі сіл праціўніка.

«Не фанабэрыцца перамогай» — гэта тая самая асаблівасць у характары Леніна, якая дапамагала яму цвяроза ўзважваць сілы праціўніка і страхаваць партыю ад магчымых нечаканасцей.

ПРЫНЦЫПОВАСЦЬ

Правадыры партыі не могуць не даражыць думкай большасці сваёй партыі. Большасць — гэта сіла, з якой не можа не лічыцца правадыр. Ленін гэта зразумеў ве горш, чым усякі іншы кіраўнік партыі. Але Ленін ніколі не станавіўся палонікам большасці, асабліва, калі гэтая большасць не мела пад сабой прынцыповай асновы. Бывалі моманты ў гісторыі нашай партыі, калі думка большасці, або мінутныя інтарэсы партыі прыходзілі ў канфлікт з кароннымі інтарэсамі пролетарыята. У такіх выпадках Ленін, не задумваючыся, рашуча станавіўся на бок прынцыповасці супроць большасці партыі. Больш таго, ён не баяўся выступаць у такіх выпадках літаральна адзін супроць усіх, разлічваючы на тое, — як ён часта гаварыў аб гэтым, — што «прынцыповая палітыка ёсць адзіна правільная палітыка».

Асабліва характэрны ў гэтых адносінах два наступных факты.

Першы факт. Перыяд 1909—1911 гг., калі партыя, разбітая контрэвалюцыяй, перажывала поўнае разлажэнне. Гэта быў перыяд бязвер'я ў партыю, перыяд павальнага бегства з партыі не толькі інтэлігентаў, але часткова і рабочых, перыяд адмаўлення падполля, перыяд ліквідатарства і развалу. Не толькі меншавікі, але і большэвікі прадстаўлялі тады цэлы рад фракцый і плыней, большай часткай адарваных ад рабочага руху. Вядома, што ў гэты іменна перыяд узнікла ідэя поўнай ліквідацыі падполля і арганізацыі рабочых у легальную, ліберальную сталыпінскую партыю. Ленін быў тады адзіны, які не падаўся агульнай пошасці і высока трымаў сцяг партыйнасці, збіраючы разрозненыя і разбітыя сілы партыі з дзіўным цярпеннем і з небывалай упартасцю, ваюючы супроць усіх і ўсякіх антыпартыйных плыней унутры рабочага руху, адстойваючы партыйнасць з небывалай мужнасцю і з нябачнай настойлівасцю.

Вядома, што ў гэтай спрэчцы за партыйнасць Ленін аказаўся потым пераможцам.

Другі факт. Перыяд 1914—1917 гг., перыяд разгару імперыялістычнай вайны, калі ўсе або амаль усе сацыял-дэмакратычныя і сацыялістычныя партыі, падаўшыся агульнаму патрыятычнаму чаду, аддалі сябе на ўслужэнне айчыннаму імперыялізму. Гэта быў перыяд, калі II Інтэрнацыянал скіліў свае сцягі перад капіталам, калі перад шавіністычнай хвалай не ўсталі нават такія людзі, як Плеханаў, Каўцкі, Гэд і іншыя. Ленін быў тады адзіным, або амаль адзіным, які падняў рашучую барацьбу супроць сацыял-шавінізма і сацыял-пацыфізма, выкрываў здраду Гэдаў і Каўцкіх і клаймёў палавінчатасць міжмажных «рэвалюцыянераў». Ленін разумеў, што ён мае за сабой нязначную меншасць, але гэта не мела для яго рашаючага значэння, бо ён ведаў, што адзіна верная палітыкай, якая мае за сабой будучыню, з'яўляецца палітыка паслядоўнага інтэрнацыяналізма, бо ён ведаў, што прынцыповая палітыка ёсць адзіна правільная палітыка. Вядома, што і ў гэтай спрэчцы за новы Інтэрнацыянал Ленін аказаўся пераможцам.

«Прынцыповая палітыка ёсць адзіна правільная палітыка», — гэта тая самая формула, пры дапамозе якой Ленін браў прыступам новыя «неприступныя» пазіцыі, заваёўваючы на бок рэвалюцыйнага марксізма лепшыя элементы пролетарыята.

ВЕРА Ў МАСЫ

Таварыкі і правадыры партый, якія ведаюць гісторыю народаў, якія прашту-дзіравалі гісторыю рэвалюцыі ад пачатку да канца, часам хварэюць адной непрыстойнай хваробай. Хвароба гэтая называецца боязню мас, неверам у творчыя здольнасці мас. На гэтай глебе ўзнікае часам нейкі зрыстакратызм правадыроў у адносінах да мас, неспрактыкаваных у гісторыі рэвалюцый, але закліканых ламаць старое і будаваць новае. Боязнь, што стыхія можа разбушавацца, што масы могуць «паламаць многа лішняга», жаданне разыграць ролю мамкі, якая стараецца вучыць масы па кніжках, але не жадае вучыцца ў мас, — — такая аснова гэтага роду арыстакратызма.

Ленін прадстаўляў поўную процілеглась такім правадырам: Я не ведаю другога рэвалюцыянера, які так глыбока верыў-бы ў творчыя сілы пролетарыята і ў рэвалюцыйную мэтазгоднасць яго класавага інстынкту, як Ленін. Я не ведаю другога рэвалюцыянера, які ўмеў-бы так блазітасна бічаваць самазадаволеных крытыкаў «хаосу рэвалюцыі» і «вакханаліі самачынных дзеянняў мас», як Ленін. Помніцца, як у часе адной гутаркі, у адказ на заўвагу аднаго з таварышоў, што «пасля рэвалюцыі павінен устанавіцца нармальны парадак», Ленін саркастычна заўважыў: «бяда, калі людзі, жадаючыя быць рэвалюцыянерамі, забываюць, што найбольш нармальным парадкам у гісторыі з'яўляецца парадак рэвалюцыі».

Адсюль пагарджальныя адносіны Леніна да ўсіх тых, якія стараліся звысока глядзець на масы і вучыць іх па кніжках. Адсюль нястомная пропаведзь Леніна: вучыцца ў мас, асмысліць іх дзеянні, стараннна вывучаць практычны вопыт барацьбы мас.

Вера ў творчыя сілы мас — гэта тая самая асаблівасць у дзейнасці Леніна, якая давала яму магчымасць асмысліць стыхію і накіроўваць яе рух у русло пролетарскай рэвалюцыі.

ГЕНІЙ РЭВОЛЮЦЫІ

Ленін быў народжан для рэвалюцыі. Ён быў сапраўды геніем рэвалюцыйных выбухаў і найвялікшым майстрам рэвалюцыйнага кіраўніцтва. Ніколі ён не адчуваў сябе так свабодна і радасна, як у эпоху рэвалюцыйных патрасенняў. Гэтым я зусім не хачу сказаць, што Ленін адпалкава алобрываў усякае рэвалюцыйнае патрасенне, або што ён заўсёды і пры ўсякіх умовах стаяў за рэвалюцыйныя выбухі, Ніколькі. Гэтым я хачу толькі сказаць, што ніколі геніяльная прозарлівасць Леніна не праяўлялася так поўна і выразна, як у часе рэвалюцыйных выбухаў. У дні рэвалюцыйных паваротаў ён літаральна расцвітаў, станавіўся яснавіцкам, прадугадваў рух класаў і імавернымя зігзагі рэвалюцыі, бачачы іх, як на далоні. Нягарма гаворыцца ў нашых партыйных колах, што «Ільіч умее плаваць у хвалях рэвалюцыі, як рыба ў вадзе». Адсюль «здзіўляючая» яснасць тактычных лозунгаў і «галавакружыцельная» смеласць рэвалюцыйных замыслаў Леніна.

Успамінаюцца два асабліва характэрных факты, якія адзначаюць гэтую асаблівасць Леніна.

Першы факт. Перыяд перад Кастрычніцкім пераваротам, калі мільёны рабочых, сялян і салдат, палганяемыя крызісам у тылу і на фронце, патрабавалі міру і свабоды; калі генералітэт і буржуазія падрыхтоўвалі ваенную дыктатуру ў інтарэсах «вайны да канца»; калі ўся так званая «грамадская думка»; усе так званыя «сацыялістычныя партыі» стаялі супроць большэвікоў, трактуючы іх «нямецкімі шпіёнамі»; калі Керэнскі прабаваў загнаць у падполле — і часткова ўжо паспеў загнаць — партыю большэвікоў; калі ўсе яшчэ магутныя дысцыплінаваныя арміі аўстра-германскай кааліцыі стаялі супроць нашых стомленых і разлагаўшыхся армій, а заходнееўрапейскія «сацыялісты» шчасліва прабывалі ў блоку са сваімі ўрадамі ў інтарэсах «вайны да поўнай перамогі»...

Што значыла падняць паўстанне ў такі момант? Падняць паўстанне ў такой абстаноўцы — гэта значыць паставіць усё на карту. Але Ленін не баяўся рыскнуць, бо ён ведаў, бачыў сваім яснавідучым поглядам, што паўстанне неміну ча, што паўстанне пераможа, што паўстанне ў Расіі падрыхтуе канец імперыялістычнай вайны, што паўстанне ў Расіі ўскалыхне змучаныя масы Захада, што паўстанне ў Расіі ператворыць вайну імперыялістычную ў вайну грамадзянскую, што паўстанне дасць Рэспубліку совэтаў, што Рэспубліка совэтаў паслужыць аплотам рэвалюцыйнага руху ва ўсім свеце.

Вядома, што гэтае рэвалюцыйнае прадбачанне Леніна збылося ў далейшым з нябачнай дакладнасцю.

Другі факт. Першыя дні пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі Совет Народных Камісараў прабаваў прымусіць мяжэжнага генерала, галоўнакамандуючага Духоніна, спыніць ваенныя дзеянні і адкрыць перагаворы з немцамі аб перамір'і. Помніцца, як Ленін, Крыленка (будучы галоўнакамандуючы) і я адправіліся ў галоўны штаб у Піцеры да проваду для перагавораў з Духоніным. Мінута была жудасная. Духонін і Стаўка катэгарычна адмаўляліся выконваць загад Саўнаркома. Камандны састаў арміі знаходзіўся цалкам у руках Стаўкі. Што датычыць салдат, то невядома было, што скажа 12-мільённая армія, напаралкаваная так званым армейскім арганізацыям, настроеным супроць Совецкай улады. У самым Піцеры, як вядома, наспявала тады паўстанне юнкераў. Апрача таго, Керэнскі ішоў на Піцер на конай. Помніцца, як пасля некаторай паузы ля проваду твар Леніна асвяціўся нейкім незвычайным святлом. Відаць было, што ён ужо прыняў рашэнне. «Пойдзем на радыёстанцыю, — сказаў Ленін, — яна нам саслужыць карысць: мы зніцем у спецыяльным загадзе генерала Духоніна, назначыв на яго месца галоўнакамандуючым т. Крыленка і звернемся да салдат праз галаву каманднага састава з заклікам — акружыць генералаў, спыніць ваенныя дзеянні, звязацца з аўстра-германскімі салдатамі і ўзяць справу міру ў свае ўласныя рукі».

Гэта быў «скачок у невядомасць». Але Ленін не баяўся гэтага «скачка», наадварот, ён ішоў яму насустрач, бо ён ведаў, што армія хоча міру, і яна заваюе мір, змятаючы па шляху да міру ўсе і ўсякія перашкоды, бо ён ведаў, што такі спосаб упвяржэння міру не пройдзе даремна для аўстра-германскіх салдат, што ён развяжа пягу да міру на ўсіх без выключэння франтах.

Вядома, што гэта рэвалюцыйнае прадбачанне Леніна таксама збылося ў далейшым з усёй дакладнасцю.

Геніяльная прозарлівасць, здольнасць быстра схватваць і разгадваць унутраны сэнс назіраемых падзей — гэта тая самая ўласцівасць Леніна, якая дапамагала яму намячаць правільную стратэгію і ясную лінію паводзін на паваротах рэвалюцыйнага руху.

«Правда» № 34, 1924 г.
(Ленін і Сталін. Выбраныя творы. Белпартвыдат. 1936 г.).

ЛЕНІН

Не! Ты жывеш, вялікі Ленін,
Ты наша шчасце, наша воля,
Цудоўны розум твой і геній
Не будуць мёртвымі ніколі.

З табой ідзем паходным маршам,
Мінаем год адзін, другі...
Ты гаралы будуеш нашы,
Ты ўсюды з намі, дарагі.

Ты не загінуў, не пагас.
І кроў твая ў нас бурліць,
Ты жар нянавісці ў нас,
Кахання несутрымны кліч.

Ты моладзь смелую вядзеш
На варту, на палі, ў рудніх,
Наперадзе калон ідзеш,
І зазяш на старонках кніг.

Ты сонца шчасця запаліў,
І ад Мадрыда да Крэмля —
Усюды знаюць на зямлі,
Як слаўна Ленінвым зямля...

Імя тваё нясе народ,
Імя тваё заве на бой,
І кожны новы наш завод
Расце і дужае табой.

Ты наша сіла і размах,
Радзіме славу мы пяем,
І у пражэктарных снапах
Чытаем словы мы твае.

Ты ў кожнай песні дружных мас
Цвіцэш над нашаю зямлёй,
На адначынку ты між нас
З усмешкай любай, дарагой.

Твой светлы розум не пагас,
Ен словам Сталіна гарыць,
Законам сталінскім для нас
Ен кожнай літарай бліскчыць.

Ты бессмяротны між жывых,
Ты — гул гісторыі людской,
Ты з даўніх кручаў снегавых
Бяжыш імкліваю ракой.

Ты ўвесь для раласных надзей,
З табой прайдзем усе гады.
Пакуль гісторыя ідзе, —
Ты будзеш з намі, правадыр!

НАІРЫ ЗАР'ЯН.
Армянскі паэт-ордэнаносец.

Пераклаў ПЯТРУСЬ БРОВКА.

У ЛЕНІНА МЫ ВУЧЫМСЯ ПРАЦАВАЦЬ

ВУЧЭННЕ ЛЕНІНА БЕССМЯРОТНА

Геній пролетарскай рэвалюцыі, арганізатар і правадыр большэвіцкай партыі, бессмяротны Уладзімір Ільіч Ленін у сваім артыкуле «Вялікі пачын» высока ацаніў першы «камуністычны суботнік». Гэта была ленінская іскра, якая потым запаліла агонь сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі нашай краіны.

Стаханаўскі рух з'яўляецца вышэйшым этапам у развіцці сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Яго прадбачыў Уладзімір Ільіч у сваіх творах. Творамі Леніна я карыстаюся ў штодзённай сваёй рабоце. Так, каб зразумець сутнасць сацыялістычнага спаборніцтва, я звяртаўся да твораў Леніна, і там зусім ясна акрэслена наша сацыялістычнае сёння. Я чытаў артыкул «Вялікі пачын», і гэта дапамагло мне забяспечыць разгортванне і кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і стаханаўскім рухам на нашым заводзе.

Стаханаўскі рух значна ўзняў вытворчасць працы і невыпадкова «новыя нормы» зараз устаралі, сталі нізкімі, іх выконваюць і перавыконваюць усе рабочыя завода, за выключэннем 33 асоб, якія нядаўна прышлі на завод. Зараз распрацоўваецца пытанне аб перагляде гэтых норм. Стаханаўцы смела ламалі старыя традыцыі прадзелу ў немагчымасці перавыконваць вытворчыя нормы. Усё гэта рабілася свядома, самімі рабочымі. Гэта паказала наколькі ўзрос тэхнічна-культурны і палітычны ўзровень кожнага рабочага, наколькі яго разуменне ўзнялося да патрабаванняў сацыялістычнай эпохі.

Поўнасцю апраўдваюцца і практычна ажыццяўляюцца словы Уладзіміра Ільіча Леніна, сказаныя ім у 1919 годзе па поваду першага «комуністычнага суботніка» на Маскоўска-Казанскай чыгунцы: «Комуністычныя суботнікі» іменна таму маюць велізарнае гістарычнае значэнне, што яны паказваюць нам свядомы і добраахвотны пачын рабочых у развіцці працоўнайнасці працы, у пераходзе да новай працоўнай дысцыпліны, у творчасці сацыялістычных умоў гаспадаркі і жыцця».

Вучэнне вялікага Леніна бессмяротна, яно асвятляе нам шлях у безупынным руху да комунізма.

Сакратар парткома завода імя Варашылава БУЕВІЧ.

ГЕНІЙ ЛЕНІНА ВЫЗНАЧЫЎ НАША ПРЫГОЖАЕ СЁННЯ

Вучэнне Леніна бессмяротна. У ім мы знаходзім вычарпальны адказ на ўсе хвалюючыя пытанні сённяшняга жыцця.

Вядома, што Сталінская Канстытуцыя сацыялізма выклікала бязмерную радасць прапоўных нашай краіны і жаданне вывучаць глыбіню і значэнне кожнага яе артыкула. Каб больш папулярна і зразумела растлумачыць агітатарам, для вывучэння з рабочымі, 12 артыкул Канстытуцыі—аб тым, што «...У СССР ажыццяўляецца прынцып сацыялізма: «Ад кожнага па яго здольнасці, кожнаму па яго працы», я звярнуўся да работы Леніна «Дзяржава і рэвалюцыя», дзе ён дае ясную і поўную характарыстыку задач першай фазы комуністычнага грамадства. Ён пісаў: «Да таго часу, пакуль наступіць «вышэйшая» фаза комунізма, сацыялісты патрабуюць найсуровейшага кантролю з боку грамадства і з боку дзяржавы над мерай працы і мерай спажывання...».

Толькі геній Леніна мог з такой яснасцю і чоткасцю вызначыць будучае— г. зн. наша прыгожае сёння. Вывучэнне работ Леніна дапамагае нам у штодзённай арганізацыі і кіраўніцтве шматтраннымі партыйным жыццём.

МІНКІН.
Сакратар парткома скурзавода «Большэвік» (Менск).

ЯГО ТВОРЫ ВУЧАЦЬ НАС

Вывучэнне гісторыі партыі ў вячэрнім комвузе і на курсах прапагандыстаў прывілі мне густ і ўменне працаваць над творамі **Леніна — Сталіна.** У гэтых творах я знаходжу адказ на ўсе пытанні, з якімі сустракаюся ў практычнай прапагандысцкай рабоце. Творы Леніна збагачаюць мой палітычны кругавід.

Слухачам маёй школы, якія яшчэ самастойна не могуць працаваць над творамі Леніна, я часта зачытваю асобныя вытрымкі з іх. Так, напрыклад, вывучаючы першую тэму Канстытуцыі СССР, я чытала ў Леніна матэрыялы аб класах, класавай барацьбе і дыктатуры пролетарыята. Ленін гаварыў у сваім канспекце аб дыктатуры пролетарыята наступнае: «Дыктатура пролетарыята ёсць працяг класавай барацьбы пролетарыята, у новых формах. У гэтым гвозд. гэтага не разумеюць.

Пролетарыят, як асобы клас, адзін прадаўжае весці сваю класавую барацьбу».

Там-жа Ленін гаварыў, што ў сувязі з падаўленнем «супраціўлення эксплуататараў» будзе мець месца «асобая (вышэйшая) ажасточанасць класавай барацьбы».

У папяўжэнне гэтага тэзіса Леніна, як і ўсіх яго матэрыялаў, я знаходжу многа прыкладаў з практыкі нашага сацыялістычнага будаўніцтва і з жыцця нашага завода.

У штодзённай практычнай рабоце найкаштоўнейшыя творы **Леніна** вучаць нас, нібы жывы Ленін, які ведае наша сёння.

КАДЫШЗВІЧ.
Прапагандыст комсамольскай палітшколы менскага завода «Большэвік».

В. М. МОЛАТАЎ

НАШЫ ЗАДАЧЫ Ў БАРАЦЬБЕ З ТРАЦКІСЦКІМІ І ІНШЫМІ ШКОДНІКАМІ, ДЫВЕРСАНТАМІ І ШПІЕНАМІ*)

1. ВЫХАВАННЕ КАДРАЎ

Пачну з першага пытання — з пытання аб выхаванні кадраў.

У свой час мы сумелі зрабіць патрэбныя вывады з шахцінскай справы. Шахцінская справа паказала, што мы знаходзіліся ў вельмі вялікай залежнасці ад старых, буржуазных спецыялістаў, варожых совецкаму ладу. Яна паказала, наколькі мы былі слабы па частцы большэвіцкіх кадраў, авалодаўшых тэхнікай і вытворчасцю. Урокі шахцінскага шкодніцтва мы выкарысталі для таго, каб паставіць пытанне аб выхаванні гаспадарча-тэхнічных кадраў на новыя рэйкі.

З 1928 года, да якога адносіцца справа шахцінскіх шкоднікаў, мы пачалі перабудову ўсяе тэхнічнай адукацыі. Тады партыя прама сказала, што больш нельга мірыцца з тэхнічнай адсталасцю нашых гаспадарчых кадраў. Задача стварэння большэвіцкіх тэхнічных кадраў, задача авалодання тэхнікай, была пастаўлена перад большэвікамі як адна з самых галоўных і неадкладных.

Таварыш Сталін у пачатку 1931 года на нарадзе гаспадарнікаў гаварыў:

«Трэба прызнаць, к сораму нашаму, што і сярод нас, большэвікоў, ёсць нямала такіх, якія кіруюць шляхам падпісвання папер. А вось, каб унікаць у справу, авалодаць тэхнікай, стаць гаспадаром справы, — на гэты конт — ні-ні.

Як магло здарыцца, што мы, большэвікі, прарабіўшыя тры рэволюцыі, вышаўшыя з перамогай з жорсткай грамадзянскай вайны, вырашыўшыя буйнейшую задачу стварэння прамысловасці, павярнуўшыя сялянства на шлях сацыялізма, — як магло здарыцца, што ў справе кіраўніцтва вытворчасцю мы пасуем перад паперкай?

Прычына тут заключаецца ў тым, што напісваць паперу лягчай, чым кіраваць вытворчасцю. І вось многія гаспадарнікі паймі на гэтай лініі найменшага супраціўлення».

Далей таварыш Сталін гаварыў аб тэхнічнай справе як аб першым важным сігнале наконт недапушчальнай адсталасці нашых гаспадарнікаў у тэхнічных адносінах.

«Само жыццё не раз сігналізавала нам аб тым, што не ўсё добра ў гэтай справе. Шахцінская справа была першым сігналам. Шахцінская справа паказала, што ў партарганізацый і прафсаюзаў нехапіла рэволюцыйнай пільнасці. Яна паказала, што нашы гаспадарнікі агідна адсталі ў тэхнічных адносінах, што некаторыя старыя інжынеры і тэхнікі, працуючы бескантрольна, лягчэй скатваюцца на шлях шкодніцтва, тым больш, што іх непарыўна данімаюць «прапановамі» ворагі з-за мяжы. Другі сігнал — працэс «Промпартыі».

Таварыш Сталін так растлумачваў урокі тэхнічнага шкодніцтва:

«Як магло здарыцца, што шкодніцтва прыняла такія шырокія памеры? Хто вінават у гэтым? Мы ў гэтым вінаваты. Калі-б мы справу кіраўніцтва гаспадаркай паставілі інакш, калі-б мы значна раней перайшлі да вывучэння тэхнікі справы, да авалодання тэхнікай, калі-б мы часцей і талкова ўмешваліся ў кіраўніцтва гаспадаркай, — шкоднікам не ўдалося-б так многа пашкодзіць».

У гэтай прамове таварыш Сталін сфармуляваў і новыя задачы, устаўшыя перад намі ў першым рэканструкцыі:

«Час пакончыць з тыпай устаноўкай неўмяшання ў вытворчасць. Час усвоіць другую, новую, адпаведную цяперашняму перыяду ўстаноўку: умешвацца ва ўсё. Калі ты дырэктар завода — умешвайся ва ўсе справы, унікай ва ўсё, не ўпускай нічога, вучыся і яшчэ раз вучыся. Большэвікі павінны авалодаць тэхнікай. Час большэвікам самім стаць спецыялістамі. Тэхніка ў перыяд рэканструкцыі вырашае ўсё».

Лозунг аб авалоданні тэхнікай стаў у пэнтры задач партыі і рабочага класа. І гэта дала велізарныя станоўчыя рэзультаты. Не жадаючы гэтага, шахцінскія шкоднікі паскорылі стварэнне кадраў чырвоных спецыялістаў, паскорылі перабудову нашай тэхнічнай адукацыі.

Прывяду некаторыя лічбы па пяжкай прамысловасці. Параўнаем становішча на прадпрыемствах Народнага камісарыята пяжкай прамысловасці ў 1930 і 1936 годзе.

У 1930 годзе на тысячу рабочых у прадпрыемствах Народнага камісарыята пяжкай прамысловасці прыходзілася 20 інжынераў, а ў 1936 годзе — ужо 33 інжынеры. Калі ўзяць інжынераў, тэхнікаў і майстроў разам, то атрымоўваецца рост з 68 да 105 на тысячу рабочых. У каменавугальнай прамысловасці за той-жа перыяд колькасць інжынераў узрасла з 4 да 9, а ў хімічнай — з 33 да 52 на тысячу рабочых, занятых у вытворчасці.

Што рост новых тэхнічных кадраў прамысловасці ішоў у значнай меры за кошт комуністаў, відаць з наступных фактаў.

За тры гады — з 1933 па 1936 — колькасць комуністаў узрасла з 9 да 24 проц. сярод агульнай колькасці галоўных інжынераў шахт, па якіх ёсць адпаведны ўлік. У хімічнай прамысловасці колькасць комуністаў сярод галоўных інжынераў прадпрыемстваў за той-жа перыяд узрасла з 20 да 28 процантаў.

Індустрыяльныя ВНУ ў 1928 годзе выпускалі ўсяго каля 9 тысяч чалавек. У 1936 годзе выпуск з гэтых ВНУ ўзняўся да 36 тысяч, г. зн. павялічыўся за гэты тэрмін у 4 разы. Агульная колькасць вучняў у ВНУ Народнага камісарыята цяжкай прамысловасці з 1930 года, калі яна складала 57,5 тысяч чалавек, узнялася ў 1936 годзе да 108,6 тысяч чалавек, г. зн. павялічылася за 6 год прыблизна ў два разы. За гэты-ж перыяд колькасць вучняў у тэхнікумах Народнага камісарыята цяжкай прамысловасці павялічылася з 42,7 тысяч да 80 тысяч чалавек.

За апошнія гады разгарнулася тэхвучоба рабочых, занятых на вытворчасці. Ад 2/3 да 3/4 рабочых цяжкай прамысловасці ахоплены тэхвучобай у рознага роду школах і курсах. Тэхвучоба няўхільна разгортваецца і ў іншых галінах прамысловасці.

Усё гэта гаворыць аб тым, што ў справе падрыхтоўкі гаспадарча-тэхнічных кадраў, у стварэнні новых кадраў кваліфікаваных прамысловых работнікаў наогул за апошнія гады зроблена велізарная справа.

Цяпер мы ўжо не так слабы ў тэхнічных адносінах, як гэта было ў перыяд шахцінскай справы і ў перыяд «Промпартыі». Мы многае зрабілі для таго, каб правесці ў жыццё лозунг аб авалоданні тэхнікай і вытворчасцю. Мы маем цяпер свае, совецкія, гаспадарча-тэхнічныя кадры, у асноўным авалодаўшыя сваёй справай. Іх ужо нямала, яны цвёрда стаяць на нагах.

Аднак, трэба прызнаць, што правядзенне задачы авалодання тэхнікай праходзіла ў многіх выпадках аднабока, са стратай для большэвіцкага выхавання кадраў. Авалодаўшы тэхнікай, многія нашы работнікі адсталі ў сваім палітычным развіцці ад сучасных, больш складаных палітычных задач.

Вузкае дзяліцтва, абмежаванне светапогляду вузка-гаспадарчымі рамкамі, адрыў ад партыйна-палітычных задач і пароджаная ўсім гэтым палітычная блізарукасць сталі лёсам многіх нашых работнікаў гаспадарчага фронта. Замест павышэння большэвіцкай пільнасці, многія работнікі прамысловасці і транспарту палітычна адсталі, папалі ў русло абывацельскай дабрадушнасці, палітычнай бестурботнасці. Трэба прызнаць, што, захапіўшыся поспехамі і перавыкананнем планаў, многія з нашых таварышоў гаспадарнікаў, ды і не толькі гаспадарнікаў, адсталі вялікую даць самасупакоенасці і самадавольству, якія столькі чужды большэвіцкім якасям.

Партыя высунула лозунг—«Большэвікі павінны авалодаць тэхнікай». Здаецца, зразумела, што справа ішла аб авалоданні тэхнікай большэвікамі, што партыя заклікала гаспадарнікаў авалодаць тэхнікай так, як гэта належыць большэвікам. Па справе зачастую атрымлівалася так, што, авалодваючы тэхнікай, нашы таварышы забывалі аб сваіх большэвіцкіх абавязках і палітычна ішлі не ўперад, а назад. Гэта скарыстаў вораг, каб не толькі зло пасмяцца над палітычнай блізарукасцю некаторых, нават вельмі буйных, нашых работнікаў, але каб нанесці дзяржаве нямалую страту. У нас нярэдка атрымалася, што авалоданне тэхнікай ішло разам з паслабленнем большэвіцкіх якасцей работніка. Нам-жа патрабуецца авалоданне тэхнікай у поўным сэнсе гэтага слова з далейшым узмацненнем большэвіцкіх якасцей нашых кадраў.

З гэтага відаць, якія патрабаванні мы павінны прад'яўляць да нашых гаспадарчых кадраў. Спынюся на гэтым падрабязней.

Зразумела, што, па-першае, да ліку такіх патрабаванняў адносіцца веданне сваёй справы, інакш кажучы поўнае авалоданне тэхнікай, «вытворчасцю і ўсёй даручанай справай, як гэта патрабуецца для сапраўднага кіраўніка. Ні аб якім паслабленні гэтага патрабавання да нашых кіруючых кадраў не можа быць і гутаркі. Наадварот, урокі шкодніцтва, дыверсій і шпіянажу трацкісцкай і замежнай агентуры, не раз валіўшай за нос нашых гаспадарчых кіраўнікоў, падкрэсліваюць неабходнасць далейшай упартай барацьбы за авалоданне тэхнікай. Той, хто яшчэ не ведае па-сапраўднаму даручанай работы, той павінен вывучаць справу, унікаць у яз, вучыцца працаваць. Вучыцца не толькі ў сяброў, але і ў ворагаў, не толькі ўнутры краіны, але і заграніцай — ва ўсіх, у каго можна, каб авалодаць сваёй справай па-сапраўднаму ў поўным сэнсе слова. Без сур'ёзнага ведання сваёй справы зараз не можа быць сапраўднага кіраўніка ні ў адной галіне работы.

Здольнасць да самакрытыкі, развіццё гэтай здольнасці — такое другое патрабаванне да нашых кадраў, якое трэба рашуча падкрэсліць у сувязі з урокамі шкодніцтва трацкістаў. Без развіцця гэтай здольнасці, без сапраўднай самакрытыкі не можа быць сапраўднага руху нашых кадраў наперад. Без развіцця здольнасці да самакрытыкі нельга марыць аб дасягненні задачы дагнаць і перагнаць перадавыя па тэхніцы капіталістычныя краіны. Мы праводзім тэхнічную рэканструкцыю ўсёй народнай гаспадаркі, мы хочам унядрыць і ўнядраем новую тэхніку, перадавыя вытворчыя метады, вышэйшыя сучасныя вытворчыя нормы. Мы рухаемся па гэтаму шляху наперад, але яшчэ ў многім адстаем ад перадавых па тэхніцы капіталістычных краін. Каб хутчэй авалодаць усімі дасягненнямі сучаснай тэхнікі, мы павінны падвергнуць нашу работу, нашы дасягненні і поспехі старанной праверцы, сур'ёзнай крытыцы. Нельга супакойвацца на маючыхся поспехах, трэба дашукваца прычын, па якіх мы яшчэ ў многіх выпадках далёка адстаем ад перадавых у тэхнічна-вытворчых адносінах замежных дзяржаў, ад дасягнутага імі ўзроўню прадукцыйнасці працы, ад дасягнутых імі вытворчых норм і якасці работы.

Без самакрытыкі, без развіцця здольнасці да сапраўднай самакрытыкі нельга рухацца наперад. У нашых умовах гэта асабліва важна. У нашых умовах ізе хуткі рост новых тэхнічных кадраў, ёсць нямала людзей, здольных і жадаючых сваёй ініцыятывай, практычным вопытам і ведамі дапамагчы справе. Трэба выхоўваць у нашых работніках чуласць і ўменне прыслухоўвацца да сігналаў, ідучых знізу, з боку радавых работнікаў і тэхнікаў. Трэба дабіцца таго, каб кіраўнік адносіўся да гэтых сігналаў не па-чыноўніцку бяздушна, не па-саноўнаму высокамерна. Патрабна ўважлівасць нават тады, калі сігнал ідзе з чуждага асяроддзя і па чуждых нам матывах. Калі мы разаўём гэту здольнасць, здольнасць па-большэвіцку ўнікаць у гэтыя сігналы, падвяргаць праверцы любое, часамі, здавалася-б абсалютна праверанае становішча ў сваёй рабоце, тады мы хутчэй будзем выпраўляць нашы недахопы і папярэдзім проіскі многіх шкоднікаў і дыверсантаў. Паслабленне-ж самакрытыкі, няздольнасць да яе развіцця вядуць да бюракратызацыі і акасцянення, што лёгка выкарыстоўваюць нашы ворагі ў сваіх антысовецкіх мэтах, у мэтах шкодніцтва і дыверсійна-шпіёнскай работы. Чым больш мы разаўём наша ўменне разбірацца ў недахопах сваёй работы, уменне адрозніваць станоўчае і творчае ад фармальна-бюракратычнага, тым хутчэй нашы кадры будуць расці як сапраўдныя большэвіцкія арганізатары, і тым хутчэй народная гаспадарка нашай краіны дагоніць і перагоніць перадавыя сучасныя паказальнікі ў тэхніцы, у вытворчасці і ў іншых галінах. Калі мы злучым такія якасці, як веданне справы і здольнасць да самакрытыкі, мы расчысцім наш шлях ад усялякіх шкоднікаў і забяспечым дасягненне любых сучасных тэхнічных і вытворчых паказальнікаў.

Чэснасць у адносінах да дзяржавы — такая яшчэ адна якасць гаспадарча-тэхнічных кадраў, якую мы павінны ўсямерна выхоўваць і ўмацоўваць. У нашай краіне, дзе асноўныя гаспадарчыя і культурныя каштоўнасці належаць дзяржаве, ажыццяўляючай волю працоўных, дзе, з другога боку, многія кіраўнікі праяўляюць бесклапотнасць наконт барацьбы са злодзеямі і казнакрадамі і дзе так яшчэ моцны дробнабуржуазныя, або, інакш кажучы, драпежніцка-анархічныя звычкі ў работнікаў дзяржапарата — ніяк нельга лічыцьазорным нагадваць аб неабходнасці выхоўвання нашых кадраў у духу сапраўднай добрасумленнасці і чэснасці ў адносінах дзяржавы. Між тым аб гэтым зноў і зноў прыходзіцца гаварыць, бо ў нас нямала фактаў ашуканства дзяржавы, часамі, да нашага сораму, праводзімага з заахвочвання кіраўнікоў, у тым ліку і партыйных кіраўнікоў. Адны прыпіскі вуглездабычы ў Данбасе што значаць! Колькі мы ні асуджалі за гэта, колькі ні аддавалі пад суд, а і зараз яшчэ не выкарчавалі многіх жульніцтваў з прыпіскай здабычы вугля на шахтах Данбаса і ў іншых раёнах. Ці няма сярод нашых кіраўнікоў такіх работнікаў, якія глядзяць скрозь пальцы на прыпіску вуглездабычы, якія палпісваюць, каб прыхарашыць сваё становішча перад вышэй стаячымі органамі, прыпраўляць рапарты аб скончанні пабудоў і аб выкананні вытворчых планаў раней сапраўднага іх выканання? Для таго, каб хутчэй высунуцца, накрасаваца хаця-б на момант, іншы раз і нядранныя арганізатары-гаспадарнікі ідуць на фальш, на абман дзяржавы. А ўжо вакол такіх кіраўнікоў кар'ерыстаў шукайце кучу падхалімаў і халуёў, за спіну якіх так зручна хавацца ўсялякім шкоднікам-мярзотнікам. У нашых умовах паслабленне працоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах і ва ўстановах на руку толькі злейшым ворагам працоўных. У нашых умовах патуранне абману дзяржавы з боку кіраўнікоў устаноў і прадпрыемстваў, хаця-б для таго, каб адхартаваць і пахваліцца «поспехамі», або проста міжтаго нежаданага з'явішча, што само выяўленне і выкрыццё трацкісцкіх дыверсантаў, пасля таго, як дыверсійная работа трацкістаў стала відавочнай, адбывалася пры пасіўнасці раду органаў прамысловасці і транспарту. Выкрывалі трацкістаў звычайна органы НКУС і асобныя члены партыі — добраахвотнікі. Самі-ж органы прамысловасці і ў некаторай ступені таксама транспарту не праяўлялі пры гэтым ні актыўнасці, ні тым больш — ініцыятывы. Больш таго, некаторыя органы прамысловасці нават тармазілі гэту справу».

Ці правільна гэта ўказанне, ці няправільна? Ці правільна, што нашы гаспадарнікі не дапамагалі выкрыццю шкодніцтва, а часамі нават тармазілі яго? Так, правільна. Гэтага не аспрэчыш.

Мы маем велізарныя поспехі ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве, але раступ і нашы палітычныя задачы. Нам прыходзіцца лічыцца і з тым фактам, што наш класавы вораг прыбягае да новых, больш хітрых, больш замаскіраваных метадаў барацьбы. Ад нашых кіраўнікоў патрабуецца ўменне распазнаць і выкрыць гэтыя новыя манеўры ворага. Для гэтага неабходна пашырыць палітычны кругазор нашых кадраў, прывіць ім зоркасць да ворага, чым-бы ён ні маскіраваўся. Толькі ў гэтым выпадку, толькі з гэтымі большэвіцкімі якасцямі нашы гаспадарнікі і іншыя работнікі будуць дастойны імя сапраўдных кіраўнікоў.

Шматлікія факты выкрытага шкодніцтва, дыверсій і шпіянажу япона-нямецка-трацкісцкіх агентаў гаворыць аб тым, што патрэбныя большэвіцкія якасці ў нашых гаспадарча-тэхнічных кадраў ва многіх выпадках зараз адсутнічаюць. Таму ў нас распладзілася нямала шкоднікаў, дыверсантаў і шпіёнаў. Таму нашы работнікі дрэнна распазнаюць трацкістаў і іншых двурушнікаў. Час ужо ўсур'ёз узяцца за барацьбу з гэтымі ганебнымі з'явішчамі.

Прывяду прыклады таго, як у некаторых выпадках нам удавалася сарваць намеры трацкісцкіх шкоднікаў. Возьму для прыкладу пытанні хіміі, дзе дзякуючы ўмяшанню тав. Орджанікідзе быў сарван рад буйных шкодніцкіх планаў.

У серна-кіслотнай прамысловасці трацкісцкія шкоднікі ўсяляк стараліся знізіць вытворчыя магутнасці заводаў. Яны ўмоўлена даказвалі, што магутнасць гэтых заводаў не забяспечвае выканання намечанага плана вытворчасці сернай кіслаты. Пасля праверкі аказалася, што шляхам інтэнсіфікацыі вытворчага працэса можна даць на дзейнічаючым абсталяванні сернай кіслаты на 60 проц. больш таго, што намячалася. Дзякуючы гэтаму ўжо на 1937 год серна-кіслотным заводам аказалася магчымым даць вытворчы план, значна перавышаючы называўшуюся раней «вытворчую магутнасць заводаў», хаця работы па інтэнсіфікацыі яшчэ не скончаны. Трэба праяўжыць работу па выкрыццю шкодніцкіх спраў у гэтай галіне прамысловасці, і мы дабіемся далейшых поспехаў.

Вось другі прыклад. На другой галіне прамысловасці Галоўоргхімпром Наркамцяжпрома для падвяення вытворчай магутнасці прамысловасці патрабаваў капіталаўкладанняў не больш і не менш, як 1300 мільёнаў рублёў. І тут пастаўленая тав. Орджанікідзе задача інтэнсіфікацыі вытворчасці на заводах дазволіла рашыць справу інакш. Праведзеная ўжо работа па гэтых заводах дала магчымасць устанавіць, што для падвяення магутнасці патрабуецца не 1300 мільёнаў рублёў, а 350 мільёнаў рублёў, — напаўна, і таго менш. І ў гэтай справе шкодніцкія планы з іх бясчэсна-рвацкімі патрабаваннямі ў адносінах да дзяржавы былі выкрыты.

Прыклады з серна-кіслотнай і іншымі галінамі прамысловасці, маючымі вялікае значэнне для абароны краіны, дастатокам павучальныя. На гэтых прыкладах відаць, як зарваўшыяся шкоднікі атрымалі адпор ад кіраўніцтва наркамата. Але і ў гэтых выпадках нам не ўдалося своечасова выкрыць шкодніцтва і шкоднікаў. Шкодніцкія планы ў даным выпадку былі апрацаваны, але арганізацыя шкоднікаў на чале з Ратайчаком і іншымі аставалася да нядаўняга часу нявыкрытай.

Усім вядома барацьба з так званым «празельчаствам» у Наркамаце шляхоў зносін. Трацкісцкія шкоднікі ў Наркамаце шляхоў зносін спрабавалі прыкрыць сваю антызяржаўную работу навукай і тэхнічнымі меркаваннямі, даказваючы немагчымасць далейшага росту нагрузкі на чыгуначным транспарце без новых вялікіх капіталаўкладанняў. Планы шкоднікаў-«празельчыкаў», як вядома, былі сарваны. Тав. Кагановіч паспяхова разгарнуў барацьбу з «празельчыкамі» ў Наркамаце шляхоў зносін, і, як вядома, гэта дало вялікія станоўчыя рэзультаты. Псеўданавуковыя і псеўда-тэхнічныя прарачанні шкоднікаў-«празельчыкаў» былі разгромлены практычнымі поспехамі чыгуначнага транспарту. Гэтым была зроблена вялікая справа для дзяржавы. Але ўся справа ў тым, што шкоднікі ў Наркамаце шляхоў зносін сядзелі не толькі ў планавых органах, прапаведваўшых «тэорыю празелаў». Пасля разгрому «празельчыкаў» трацкісцкая шкодніцкая арганізацыя ў Наркамаце шляхоў зносін асталася існаваць і прадаўжала сваю здрадніцкую справу, асабліва навастрэўшыся ва ўтварэнні аварый і крушэнняў. Гэта — нам лішні напамінак аб неабходнасці разгарнуць барацьбу са шкодніцтвам і шкоднікамі да канца.

Зразумела, выкрыццё шкоднікаў ляжыць перш за ўсё на органах Наркамата ўнутраных спраў. Але нельга ўсю адказнасць за выкрыццё шкоднікаў узвальваць на органы Наркамата ўнутраных спраў. Для чаго-небудзь сядзяць-жа кіраўнікі ў сваіх арганізацыях, атрымліваюць-жа яны сігналы ад работнікаў свайго апарата, павінны-ж яны хоць часамі адчуць небяспеку з боку ворага, калі вораг вядзе падкопы!

Ці зразумелі нашы гаспадарчыя кіраўнікі зараз свае большэвіцкія абавязкі ў барацьбе са шкоднікамі, дыверсантамі і шпіёнамі — вось у чым галоўнае пытанне. Гэта яшчэ трэба даказаць. Гэта неабходна даказаць кожнаму кіраўніку на сваім посту, на сваёй рабоце. Без гэтага нельга ўзняць палітычнае выхаванне кадраў, узмацніць пільнасць і ўменне змагацца з ворагам. Кіраўнікі абавязаны прынамсі зараз, калі шмат якія факты ўжо выкрыты, растлумачыць сваім работнікам, дзе яны памыліліся, хто дапусціў гэтыя ўпушчэнні, чаму адбыліся гэтыя факты. Як інакш можна прымусіць людзей задумацца над сваімі недахопамі, як інакш пашырыць палітычны кругазор работнікаў, калі мы не будзем іх вучыць гэтаму на канкрэтных прыкладах, на канкрэтных памылках і недахопах работы.

Некаторыя думаюць адгаварыцца прызнаннем «некаторых недахопаў» у «некаторых звеннях». Але такія прамовы не варты ні граша. Кіраўнік, у якога выкрыты буйныя недахопы, небяспечныя шкоднікі, наяўнасць важных фактаў палітычнай бестурботнасці, павінен чесна, на канкрэтных прыкладах, растлумачыць сваім работнікам, свайму актыву, прычыны гэтых з'явішч. Толькі так можна папярэдзіць новыя правалы і новыя падкопы ворагаў. Без гэтага нельга гаварыць аб большэвіцкім выхаванні кадраў, без гэтага кіраўнік — не кіраўнік, а бюракрат, саноўнік, што хочаце, але не большэвіцкі прадстаўнік на адказным посту.

Нам прадстаіць вялікая практычная работа па ліквідацыі шкодніцтва. Наколькі паспяхова справімся мы з гэтай задачай, будзе залежыць ад таго, ці зможам мы па-большэвіцку падыйсці да гэтага важнага пытання. Ёсць вялікая небяспека, што некаторыя нашы гаспадарнікі яшчэ дрэнна ўлічылі ўрокі шкодніцтва, яшчэ не вызваліліся ад палітычнай бестурботнасці і адносяцца да гэтай справы пасяхоўна, несур'ёзна.

Прывяду цяпер пару такіх прыкладаў, з якіх відаць, што выкрыццё фактаў шкодніцтва — справа няпростая.

Тыповым у гэтых адносінах можна лічыць становішча з волавам. На працягу доўгага часу многія нашы добрыя намеры шкоднікі ў алавянай прамысловасці правальвалі з трэскам. Мы адчуваем патрэбу ў волаве, трацім вялікія сродкі для яго імпарту, таму, здавалася, Наркамцяжпром павінен быў-бы дабіцца правільнай арганізацыі гэтай справы і пакончыць з ганебнымі разважаннямі ўсялякіх шкоднікаў і хвасцістаў аб адсутнасці залежаў волава ў СССР. Але, да нашага сораму, нам да гэтага часу не ўдалася гэтага зрабіць. Гады тры таму назад, наперакор глаўку, прышлося аддаць пад суд кіраўніцтва адпаведнага трэста і некаторых іншых работнікаў, яўна зрываўшых гэту справу. Але зробленае аднаўленне асабістага складу ў алавянай прамысловасці да істотнага паляпшэння не прывяло. Пятакову ўдалося пасадзіць у Галоўнікельволава, якому падпарадкавана алавяная прамысловасць, шкодніка з партыйным білетам — Языкова, і мы ўсё яшчэ астаемся з мізэрнай вытворчасцю волава ў краіне. Тым не менш, не падлягае сумненню, што зараз, прыняўшы меры да ачысткі алавянай прамысловасці ад шкоднікаў і ўлічыўшы нядаўні ўрок, мы хутка рушым гэту работу наперад.

Другім прыкладам не выкрытага да канца шкодніцтва можна лічыць Уралвагонбуд. Справа ідзе аб буйнейшым вагонабудаўнічым заводзе, які павінен ў бліжэйшыя гады даваць галоўную масу вагонаў сучаснага тыпу. На чале гэтага будаўніцтва на працягу ладу год стаяў актыўнейшы шкоднік Мар'ясін, прычым сакратаром партыйнага камітэта на «Уралвагонбудзе» быў таксама шкоднік-трацкіст Шаліка-Окуджава. Некалькі месяцаў, як гэтыя шкоднікі выкрыты. Здавалася, трэба было з гэтага зрабіць адпаведныя ўрокі. Наколькі мы сумелі гэта зрабіць, — відаць з наступнага.

У лютым гэтага года па даручэнню Наркамцяжпрома, для праверкі шкодніцкіх спраў па «Уралвагонбудзе» выязджала спецыяльная аўтарытэтная камісія. На чале гэтай камісіі былі пастаўлены такія таварышы, як начальнік Галоўбудпрома тав. Гінзбург і кандыдат у члены ЦК ВКП(б) тав. Паўлуноўскі. Да якіх-жа высноў прышла гэта камісія? Камісія так сфармулявала агульныя свае вывады па Уралвагонбуду: «Азнаямленне з Уралвагонзаводам прывяло нас да цвёрдага пераканання, што шкодніцкая работа Пятакова і Мар'ясіна на будоўлі не атрымала вялікага развіцця».

Аказваецца, шкодніцтва ў «Уралвагонбудзе» «не атрымала вялікага развіцця». Камісія прабуе абгрунтаваць гэтыя свае вывады, звяхячы недахопы ў будаўніцтве да некаторых перавыдаткаў і да адставання ў будаўніцтве падсобнай гаспадаркі. Але палітычная блізарукасць камісіі зусім відавочна. Нават ранейшых паказанняў шкодніка Мар'ясіна было дастаткова для таго, каб зразумець, што камісія Гінзбурга — Паўлуноўскага змазала фактычнае становішча справы на будоўлі. Дастаткова сказаць, што гэта камісія не прывяла ні аднаго факта шкодніцтва на будоўлі. Атрымоўваецца, што матэрый шкоднік Мар'ясін разам з іншым шкоднікам, Окуджавай, самі на сябе напаклёпнічалі. Між тым, пакуль камісія ездзіла на Урал, Мар'ясін даў новыя паказанні, дзе больш канкрэтна ўказвае, у чым заключалася яго шкодная работа на будоўлі. Ён указвае пры гэтым на пэлы рад фактаў шкодніцтва ў Уралвагонбудзе, якія прайшлі міма вачэй паважаемай камісіі. Пасля гэтага, таварышы з Наркамцяжпрома, ці не належыць прызнаць, што трэба па-сур'ёзнай правяраць шкодныя справы розных Мар'ясіных і прызнаць, што некаторыя праверачныя камісіі схільны вельмі павярхоўна адносіцца да сваіх задач.

Факт з праверачнай камісіяй па «Уралвагонбуду» гаворыць аб тым, што не глядзячы на ўсе ўрокі, мы вельмі туга перабудоўваемся, працягваем хварэць няўменнем распазнаваць ворага, праяўляем і цяпер лішак палітычнай блізарукасці.

Наркамцяжпром, мусіць быць, яшчэ разбяраецца ў гэтай справе больш сур'ёзна, але зараз важна зрабіць урок з работы гэтай камісіі для ліквідацыі паслядстваў шкодніцтва палкам. Работа гэтай камісіі паказала, наколькі недастаткова было пастаўлена палітычнае выхаванне гаспадарнікаў, нават калі мы маем справу з буйнейшымі прадстаўнікамі цяжкай прамысловасці. Нават такія буйныя работнікі, як Паўлуноўскі і Гінзбург, правяраючы работу шкоднікаў на месцы, не знайшлі патрэбным указаць хоць-бы на адзін факт шкодніцтва. Нават яны зялі ўсю справу да дробных недахопаў, не заўважыўшы шкодніцтва. Але-ж гэта дае тон, і дрэнны тон, іншым работнікам прамысловасці.

Відавочна, нават у Наркамцяжпроме, не гаворачы ўжо аб Наркамлегпроме, Наркамхарчпроме, Наркамлесе і іншых наркаматах, у адносінах палітычнага разумення выкрытых фактаў шкодніцтва справа абстаіць далёка не добра. Факты паказваюць, што аб наяўнасці палітычнай пільнасці ў адносінах ворага гаварыць рана. Нашы практычныя работнікі ва многіх выпадках так палітычна адсталі, палітычны кругазор іх так замкнуўся, што яны нялёгка разбіраюцца нават у відавочных палітычных фактах. З рэзультатаў работы камісіі Наркамцяжпрома трэба зрабіць урок для ўсёй нашай работы: у нас няма належнай пільнасці да ворага, трэба ўзняць справу большэвіцкага выхавання кадраў.

Мы запусцілі справу палітычнага выхавання гаспадарнікаў. Цяпер мы павінны ўзняць іх палітычную пільнасць, пашырыць іх палітычны кругазор, прывіць і ўзмацніць іх большэвіцкія якасці. Задача ўзмацнення палітычнага выхавання гаспадарчых кадраў—актуальнейшая задача дня.

Узмацненне большэвіцкай пільнасці — важнейшая ўмова паскарэння далейшага росту ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва.

2. ПАДБОР РАБОТНІКАЎ

Другое пытанне, значэнне якога ў сувязі з урокамі шкодніцтва нельга пераўвялічыць, гэта—падбор работнікаў. І ў гэтых адносінах перад намі ўскрыліся цяпер вялікія недахопы нашай работы, з якімі належыць сур'ёзна лічыцца.

Пачну з пытання аб адносінах да былых трацкістаў. Цяпер можна чакаць у некаторых выпадках шарахання з адной крайнасці ў другую: ад бестурботнасці ў адносінах трацкістаў-шкоднікаў да агульнага паходу супроць былых трацкістаў. Гэтага нельга дапусціць. Мы часта чуем цяпер такое пытанне: значыць, нельга мець справу з былымі трацкістамі? Значыць, трэба знімаць з пастоў усіх былых трацкістаў? Такі агульны падыход і ў гэтым выпадку, відома, няправільны. Мы не можам лічыць памылкай усякае прызначэнне былога трацкіста на адказны пост. Мы не можам адмовіцца ад выкарыстання на адказнай рабоце былога трацкіста толькі за адно тое, што калісьці, у свой час, ён выступаў супроць партыйнай лініі. Трэба разабрацца і сур'ёзна разабрацца ў гэтай справе, перш чым адмовіцца ад выкарыстання яго на той або іншай рабоце ў даны момант. Дапамагаючы такім таварышам канчаткова ізжыць іх мінулыя памылкі, правяраючы іх на рабоце, пад кантролем партыйнай арганізацыі, мы выконваем патрэбную для партыі справу. Але мы ні ў якім выпадку не можам лічыць правільным такое становішча, калі прызначаючы былога трацкіста або каго-б та ні было іншага, мы не ўмеем арганізаваць належнага кантролю за яго работай. Гэта ўжо наша віна, віна кіраўнікоў, калі мы не ўмеем на справе правяраць, належным чынам кантраляваць работу былых трацкістаў і іншых работнікаў.

Але сярод нашых людзей ёсць і такія, якія разважаюць на гэты конт зусім няправільна. Яны гатовы адным махам прызнаць мінулую барацьбу трацкістаў з партыяй неістотнай справай для ланага моманту. Яны гатовы выкарыстаць усіх былых трацкістаў без разбору, бо, ці бачыце, без іх не абыйдзешся, што ўжо проста смехатворна. Нельга не прызнаць, што ў гэтым сказваюцца зусім неболь-шэвіцкія адносіны да справы, што гэта абывацельскі апалітыцызм, у корані чужды большэвізму. У гэтым нельга не бачыць спробы адмахнуцца ад адной з самых важных абавязкаў кіраўніка — ад абавязку сур'ёзна займацца расстаноўкай і падборам работнікаў. Займацца гэтай справай, відома, не так проста, як здаецца тым таварышам, якія перадаручаюць гэту справу абы каму з свайго апарата. Трэба ведаць сваіх работнікаў, трэба сачыць за іх работай, правяраць іх работу, крытыкаваць адстаючых і звальняць няздольных і абюракраціўшыхся, заўважаць новых, растучых работнікаў і актыўна дапамагаць і іх вылучэнню.

Большэвіцкі падыход да справы патрабуе ўмення правяраць работнікаў з улікам іх дзелавых і палітычных якасцей. Нельга правяраць работнікаў проста па анкетах аб іх мінулай дзейнасці. Гэта — не сапраўдная праверка. Нельга кіравацца выпадковымі ўспамінамі і спраўкамі аб іх ранейшай рабоце. Так лёгка можна падвесці справу. Недапушчальна вырашаць пытанне аб прыгоднасці работніка па асабістых прывязанасцях і сімпатыях. Тады ад падхалімства некуды будзе падзецца. Няправільна таксама меркаваць аб работніках па рапартах, хаця-бы і па рапартах аб перавыкананні планаў. Крытэрыем у падборы работнікаў павінны быць як іх дзелавыя, так і іх палітычныя якасці, аб якіх кіраўнік павінен ведаць,—ведаць не па чутках і не па паперках, а ўсур'ёз, на падставе штодзённага наглядання за работай і на падставе пастаяннай праверкі работы гэтых людзей. Толькі такі падбор работнікаў можна лічыць большэвіцкімі адносінамі да справы.

Тады мы пакончым з такімі фактамі, якія інакш, як ганебнымі, назваць нельга...

... Ужо час прызнаць, што кіраўнік адказвае за падбор работнікаў. Якога-б высокага звання і чына не быў чалавек, але калі ён не здольны прыкмеціць шкоднікаў, працуючых пад носам, і нават не хоча ўнікаць у такія пытанні, — ён не кіраўнік, а канцылярыст, пусты чыноўнік. Ніхто не застрахаван ад таго, што да

(Працяг на 4 стар.)

*) З артыкула «Урокі шкодніцтва, дыверсіі і шпіянажу япона-нямецка-трацкісцкіх агентаў», апублікаванага ў журнале «Большэвік» № 8. Гэты артыкул у «Большэвіку» перадае, з невялікімі аменамі, даклад таварыша Молатава на апошнім Пленуме ЦК ВКП(б).

ПРАЦЯГ АРТЫКУЛА тав. В. М. МОЛАТАВА

ято не падкрадзецца, пад той ці іншай лічынай, вораг і прамы здраднік,—памылкі, зразумела, магчымы. Але калі ты дапусціш у сваім акружэнні суцэльную гніль, калі акружыш сябе ўсякімі чужымі і падазронымі людзьмі, калі ты сам не праявіш ініцыятывы ў барацьбе з гэтым акружэннем, то як-жа можна зняць з цябе адказнасць за бестурботнасць, за неразборлівасць, за палітычную блізарукасць? Не так лёгка разгадаць ворага-двурушніка, які прыкрываецца лічынай адданасці, а часамі і мінулымі заслугамі. Але мы павінны разумець, што кіраўнік павінен развіваць у сабе тыя якасці, якія неабходны для распазнавання ворага. Хто з кіраўнікоў не клапоціцца аб развіцці гэтых якасцей, не развівае ў сабе здольнасці распазнаваць усе і ўсякія прыёмы ворагаў, у тым ліку прыёмы самых спрытных у прыспасабленстве і двурушнічстве здраднікаў, той адмахваецца ад аднаго з асноўных большэвіцкіх абавязкаў.

Хто не ведае, што нам прыходзіцца выкарыстаць на рабоце і людзей, варожых совецкай ўладзе? Мы і ад гэтага адмаўляцца не можам. Ёсць людзі з буржуазных спецыялістаў, якія пад добрым кантролем, пры належнай пільнасці кіраўнікоў могуць прынасіць і прыносяць нямалую карысць дзяржаве. Для таго, каб папярэдзіць магчымыя ў гэтым выпадку памылкі, кіраўнікі павінны па сутнасці ўнікаць у іх работу, сачыць за адпаведнымі сігналамі аб іх рабоце, правяраць усімі даступнымі сродкамі сапраўдны характар іх работы, вынаходзіць новыя сродкі праверкі, дзе неабходна старых.

Напомню на гэты конт вядатныя словы Леніна. У артыкуле «Лепш менш, ды лепш» Ленін спецыяльна вучыў гэтаму комуністаў. Там ён непасрэдна гаварыў аб работніках РСІ, але па сутнасці гэтыя ўказанні адносяцца да ўсіх нас, да ўсіх кіраўнікоў. Ленін гаварыў тады:

«...ім прыдзецца падрыхтоўваць сябе да работ, якія я не пасароміўся-бы назваць падрыхтоўкай да лоўлі, не скажу — машэннікаў, але накшталт таго і прыдумваннем асобных хітрыкаў для таго, каб прыкрыць свае паходы, падыходы і т. п.

Калі ў заходнеэўрапейскіх установах падобныя прапановы выклікалі-б нечуванае негадаванне, маральнага абурэння і т. д., то я спадзяюся, што мы яшчэ недастаткова абюракраціліся, каб быць ідэальнымі на гэта... У нас яшчэ так нядаўна пабудавана совецкая рэспубліка і навалена такая куча ўсякага хламу, што пакрыўдзіцца пры думцы аб тым, што сярод гэтага хламу можна рабіць раскопкі пры дапамозе некаторых хітрыкаў, пры дапамозе разведак, накіраваных часамі на даволі аддаленыя крыніцы або даволі кружным шляхам, ледзь ці прыдзе каму-небудзь у галаву, а калі і прыдзе, то можна быць упэўненым, што над такім чалавекам мы ўсе ад душы пасмяемся».

Ленін гаварыў далей так:

«Калі я пісаў вышэй аб тым, што мы павінны вучыцца і вучыцца ў інстытутах па вышэйшай арганізацыі працы і т. п., то гэта зусім не азначае, што я разумею гэта «вучанне» колькі-небудзь па-школьнаму, або каб я абмежаваўся думкаю аб вучэнні толькі па-школьнаму. Я спадзяюся, што ні адзін сапраўдны рэволюцыянер не западозрыць мяне ў тым, што я пад «вучэннем» у гэтым выпадку зразумець якую-небудзь напоўжартоўную прадзелку, якую-небудзь хітрыку, якую-небудзь каверзу або накшталт гэтага. Я веду, што ў заходне-еўрапейскай чынній і сур'ёзнай дзяржаве гэта мысль выклікала-б сапраўды жах, і ні адзін парадачны чыноўнік не згадзіўся-бы нават дапусціць яе да абмеркавання. Але я спадзяюся, што мы яшчэ недастаткова абюракраціліся, і што ў нас нічога, апрача вясёласці, абмеркаванне гэтай мысці не выклікае.

На самой справе, чаму не спалучыць прыемнае з карысным? Чаму не скарыстаць якую-небудзь жартоўную або напоўжартоўную прадзелку для таго, каб накрыць што-небудзь смешнае, што-небудзь шкоднае, што-небудзь поўсмешнае, поўшкоднае і т. д.?»

Вось як вучыў Ленін правяраць работнікаў, калі справа ідзе аб ахове інтарэсаў дзяржавы, аб абароне інтарэсаў прапоўных. Каб выкрыць ворага або поўворага, каб выкрыць што-небудзь «шкоднае» або «поўшкоднае» Ленін раіў ужываць «хітрыкі», «разведкі», «каверзы», «прадзелкі». Калі-б мы гэтыя ўказанні Леніна сурёзна выкарыстаці ў нашай рабоце, мы многіх шкоднікаў выкрывалі-б раней, мы не дапусцілі-бы раду дыверсій, падкопаў і шпіёнскіх вылазак на заводах, у шахтах, на чыгунцы. Па крайняй меры на будучае мы павінны ўлічыць гэтыя парады Леніна так, як належыць большэвікам.

Мы нярэдка чуем ад адказнейшых таварышоў, што работнікаў ім дае партыя, партыйная арганізацыя. Гэтым хочуць сказаць, што, так званы, «адказны работнік» не адказвае за падбор работнікаў свайго апарата, што калі гэтыя работнікі хранныя, або аказаліся прама ворагамі, то адказнасць быццам нясе не непасрэдны кіраўнік, а партыйная арганізацыя, паслаўшая работніка. Такія гутаркі, балай, можна яшчэ зразумець з боку людзей беспартыйных, для якіх партыя — чужая справа. Комуністы не могуць так гаварыць: партыйная арганізацыя, зразумела, нясе адказнасць за комуніста і за тых, каго яна накіроўвае на тую ці іншую работу, але гэта не значыць, што каму-бы там ні было дано права пэнкаць імя партыі.

Наадварот, нашым пяявейшым абавязкам, абавязкам кіраўнікоў з'яўляецца абавязак правяраць на рабоце прысланых партыйнай арганізацыяй работнікаў. Накіроўваючы работніка, партыйная арганізацыя патрабуе правільнага яго выкарыстоўвання, праверкі яго здольнасцей на справе, кантролю за яго работай. Абавязак кіраўніка своечасова папярэдзіць партыйную арганізацыю аб недахопах, а тым больш аб злачынствах тых, хто непасрэдна працуе ў данага кіраўніка. Але мы нешта не сустракаемся з такім становішчам, што, скажам, кіраўнік-гаспадарнік, выкрыў таго ці іншага шкодніка, а партыйная арганізацыя яго абаранне. На справе мы маем звычайна адваротнае. Нават пасля выкрыцця шкодніка, і не гледзячы на законнае патрабаванне партыйнай арганізацыі замяніць яго чэсным работнікам, гаспадарнікі нярэдка выступаюць абаронцамі чуждых людзей, праяўляючы абывацельскую неразборлівасць, палітычную слепату. Хіба гэта не верна?

Мы нямала ўзнагароджваем гаспатарнікаў ордэнамі, праслаўляем іх поспехі. Будзем гэта рабіць і далей. Але ў нас ёсць такія людзі, якія ахвотна прыпісваюць сабе ўсе поспехі прадпрыемства або цэлай галіны прамысловасці, але лічаць сябе свабоднымі ад адказнасці за грубыя палітычныя памылкі ў сваёй рабоце, за бесклапотнасць і слепату ў адносінах шкоднікаў. Таму прыходзіцца напомніць нашым кіраўнікам не толькі аб іх маральнай і юрыдычнай адказнасці за праяўленне палітычнай блізарукасці, але трэба прама сказаць такім людзям, што яны ставяць сябе ў становішча, калі за іх спіной трацкісцкія і іншыя шкоднікі здзеквяюцца над іх бездапаможнасцю, насміхаюцца над іх палітычнай блізарукасцю. Хаця-бы гэты зларадны смех ворага прымусіў некаторых пагразшых у бестурботнасці кіраўнікоў узяцца за розум, стражэй правяраць адказныя ўчасткі сваёй работы, пільней глядзець за работай свайго апарата.

Урокі выкрытай шкодніцка - дыверсійнай работы трацкісцка-фашысцкай шайкі падкрэсліваюць неабходнасць высоўвання на кіруючыя пасты палітычна правераных, чэсных у адносінах да дзяржавы работнікаў. Там, дзе слабыя нашы кадры, мы павінны больш рашуча высоўваць палітычна правераных, хаця і недастаткова падрыхтаваных, але здольных і жадаючых вучыцца работнікаў. Такіх людзей нямала. Іх можна і патрэбна навучыць працаваць, узняць іх дзелавую кваліфікацыю.

Кіраўнік павінен уменць падабраць сваіх асноўных работнікаў, правяраць іх работу, дапамагаць ім выпраўляць недахопы ў рабоце, садзейнічаць іх палітычнаму развіццю. Кіраўнік, які не займаецца падборам асноўных работнікаў або не ўмее па-большэвіцку палыйсці да гэтай справы, — не кіраўнік, а пусты канцылярыст або балбатун. У нас шмат недахопаў у падборы работнікаў таму, што многія кіраўнікі пагарджаюць гэтай справай, забываючы аб сваёй палітычнай адказнасці, забываючы аб тым што **праверка, асабліва палітычная праверка, і расстаноўка работнікаў з улікам не толькі дзелавых, але і палітычных якасцей — важнейшая справа кожнага кіраўніка-большэвіка.**

Кіраўнік адказвае за свае кадры. Кіраўніка неабходна правяраць, перш за ўсё, па ўменню расставіць работнікаў, па ўменню падбіраць кадры з улікам як дзелавых, так і палітычных іх якасцей. Мы не вынесем належных урокаў з выкрытай дыверсійна-шпіёнска-шкодніцкай работы трацкісцкай банды, калі не даб'ёмся сур'ёзнага паляпшэння ў падборы работнікаў у нашых гаспадарчых органах і на прадпрыемствах, калі нашы кіраўнікі не зразумеюць сваёй сур'ёзнай адказнасці за гэту справу. Паленшыўшы-ж арганізацыю гэтай справы, мы яшчэ хутчэй будзем крочыць наперад ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Узняць адказнасць кіраўнікоў за падбор работнікаў — вось яшчэ адзін важны вывад з урокаў шкодніцтва.

(ПРАЦЯГ БУДЗЕ)

ПРЫЁМ У ГОНАР СОВЕЦКІХ СКРЫПАЧОЎ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 20 красавіка. (БЕЛТА). Сёння, у гонар знаходзячыхся ў Парыжы совецкіх музыкантаў—пераможцаў на брусельскім міжнародным конкурсе скрыпачоў імя Ізаі тт. Давіда Ойстраха, Лізы Гілельс, Бусі Гольштэйна, Марыны Казалупавай і Мішы Фіхтэнгольца — у паўпрадстве СССР у Парыжы адбыўся вялікі прыём.

На прыёме прысутнічалі члены ўрада — міністр авіяцыі П'ер Кот, міністр фінансаў Венсен Орыёль, міністр земляробства Монэ, міністр Віёлет, памочнік дзяржаўнага сакратара па народнай асвеце Брунцвіг, шматлікія прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, у тым ліку кітайскі пасол, іспанскі пасол, амерыканскі паверанны ў справах, літоўскі пасланнік і інш., прадстаўнікі літаратурнага, навуковага і палітычнага свету, тэпутаты, прадстаўнікі ваенных колаў — генералы Швейцгут, Келер, Жоно. На прыёме прысутнічаў таксама французскі пасол у СССР Кулондр.

ПАСЯДЖЭННЕ ФРАНЦУЗСКАГА КАБІНЕТА

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 20 красавіка. (БЕЛТА). Адбылося пасяджэнне французскага ўрада пад старшынствам прэзідэнта рэспублікі Лебрэна. У апублікаваным па гэтым поводу афіцыяльным паведамленні гаворыцца, што міністр замежных спраў Івон Дальбос далажыў урыду аб міжнародным становішчы і асабліва аб іспанскіх справах, у прыватнасці, па пытанню аб кантролі над выкананнем пагаднення аб неўмяшанні і аб эвакуацыі «добраахвотнікаў» з Іспаніі.

Пасяджэнне ўрада было прысвечана галоўным чынам, пытанню аб прымяненні 40-гадзіннага рабочага тыдня ў розных галінах народнай гаспадаркі.

ТРАЦКІСЦКІЯ АГЕНТЫ ВЫКЛЮЧАНЫ З СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 20 красавіка. (БЕЛТА). На пасяджэнні нацыянальнага совета сацыялістычнай партыі, на якім абмяркоўвалася пытанне аб дысцыпліне і агульнапалітычным становішчы Францыі, была прынята рэзалюцыя, якая выказвае даверэ ўраду Блюма і абвяшчае распушчанай так званую «левую рэволюцыйную» групу, узначальваемую Півера. Рэзалюцыя патрабуе ад усіх членаў партыі строгага выканання гэтага рашэння.

Група Півера неаднаразова парушала партыйную дысцыпліну і выступала супроць урада Блюма і народнага фронта. У спрэчках рад прамоўпаў абвінавачваў гэту групу і яе кіраўніка Півера ў прамой сувязі з трацкістамі.

Па гэтым пасяджанні нацыянальны совет пацвердзіў выключэнне з партыі двух членаў «левай рэволюцыйнай» групы і пацвердзіў выключэнне 22 членаў сацыялістычнай моладзі, прымыкаўшых да трацкісцкай групоўкі.

ЗАБЫТЫ ДАГАВОР НА СОЦСПАБОРНІЦТВА

Рабкоры і работнікі нізавога друку **Менскага завода імя Кірава** сумесна з партыйным камітэтам і рэдкалегіяй шматтыражкі «Кіравец» 25 лютага г. г. прынялі выклік рабкораў віцебскага завода імя Кірава на сацыялістычнае спаборніцтва.

Прайшло амаль два месяцы. І за гэты час ніхто на заводзе і не ўспомніў аб існаванні гэтага дагавора. Характэрна, што на нарадзе рабкораўскага актыва завода, якая праводзілася 15 красавіка, ні адзін чалавек нават і слова не сказаў, што такі дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва быў заключан.

Дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва з рабкорамі і работнікамі нізавога друку віцебскага завода імя Кірава трэба скарыстаць для разгортвання работы нізавога друку на заводзе.

Ф. СТАМБУЛАЎ.

БЕЛАРУСКАЯ ОПЕРА „НОЧЬ НА ІВАНА-КУПАЛА"

20 красавіка ў памяшканні Яўрэйскага дзяржаўнага тэатра ў Менску адбылося прослухаванне ўрыўкаў першай беларускай оперы «Ноч на Івана-Купала» беларускага кампазітара Туранкова.

Былі выкананы — увертура, хоры першага і другога актаў, арыі Алесі, Станіслава, дуэт Данілы і Параскі, танцы «Таўкачыкі» і «Лявоніха».

Выканаўцамі выступалі аркестр і хор Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета і салісты тэатра Млодзік, Бароўскі, Дзянісаў, Пукст, Балопін і Касцевіч.

Опера багата народнымі мелодыямі танцамі.

Да пачатку верасня яна будзе закончана.

СУД НАД ЗАБОЙЦАМІ МАСТАКА Ю. М. ПЭНА

ВІЦЕБСК (Кар. «Звязды»). Вячэрняе пасяджэнне суда 20 красавіка і раніцняе пасяджэнне суда 21 красавіка былі прысвечаны допыту сведак. Паказанні сведак дапоўнілі і ўдакладнілі рад важных істотных момантаў, яшчэ раз выкрылі падсудных у іх наглай хлусні.

Непасрэднага забойцу Пэна — Абрама Файнштэйна — канчаткова выкрыла сведка Самсонава Марыя (прыбіральшчыца кватэры Пэна). Абрам увесь час цвердзіў суду, што аб акалічнасцях забойства яму расказала Самсонава, якая быццам-бы, прышоўшы раніцай 1 сакавіка прыбіраць кватэру Пэна, першая сустрэлася з фактам забойства і, моў, з яе расказу ён даведаўся пры якіх абставінах Пэн быў забіт. Самсонава ўсё гэта адмаўляе.

— Я, — гаворыць Самсонава, — нічога падобнага Абраму не гаварыла, бо сама не ведала аб падрабязнасцях забойства. Прышоўшы раніцай 1 сакавіка прыбіраць кватэру Пэна, заўважыўшы, што дзверы адкрыты, і не ўбачыўшы нікога ў кватэры, я, адчуўшы няладнае, адразу-ж паведаміла аб гэтым паставому міліцыянеру. І толькі ад яго я даведалася, што Пэн забіт. З Абрамам на гэту тэму ніякай размовы не вяла.

Сведка Ліза Эдэльштэйн (пляменніца Пэна, якая пражывае ў Ленінградзе) паказала суду, што, калі яна прыязджала ў Віцебск, Файнштэйн Лея неаднаразова пагаварвала з ёю адносна афармлення спадчыны Пэна.

Абрам і Нэха неаднаразова цвярдзілі суду, што пасля ад'езду камісіі Кіраўніцтва па справах мастацтваў яны ў Пэна на кватэры больш не бывалі. У гэтай хлусні іх выкрывае сведка Хэйн Берта (суседка і прыяцелька Пэна). Хэйн заяўляе суду, што 18 лютага за два дні пасля ад'езду камісіі яна асабіста, будучы ў Пэна на кватэры, бачыла там Нэху і Абрама.

Вельмі каштоўнае паказанне, якое выкрывае сям'ю Файнштэйнаў як сапраўдных злачынцаў, дае сведка Златкіна. На гэтага чалавека сям'я Файнштэйнаў, асабліва Лея, указваді як на першакрыніцу, адкуль яны даведаліся пра забойства Пэна. Па заяве-ж Златкінай аказваецца, што справа абстаяла зусім наадварот. Яна сапраўды 1 сакавіка была ў Файнштэйн, але паведаміла ім не пра забойства Пэна, а аб тым, што Пэн, як яна сама меркавала, памёр натуральнай смерцю. Але тут-жа Лея Файнштэйн ёй заявіла: «Не, Пэн не памёр, а забіт».

Сведкі скульптар Бразер, мастакі Лейтман і Мінін у сваіх паказаннях ахарактарызавалі Пэна, як выдатнага мастака і чалавека.

Скульптар Бразер таксама расказаў суду аб тым, што ў часе яго прыезду ў Віцебск, як прадстаўніка Кіраўніцтва па справах мастацтваў пры СНК БССР, мастак Пэн выказваў сваё гарачае жаданне перадаць усе свае працы дзяржаве і прасіў яго — Бразера—паведаміць аб гэтым Саўнаркому.

Усяго па справе было дапытана 10 сведак. Услед за допытам сведак былі аглошаны акты судова-медыцынскай экспертызы. Затым старшыня суда абвясціў судовае следства закончаным і прадаставіў слова дзяржаўнаму абвінаваўцу т. Глезераву.

— У нашай квітнеючай краіне сацыялізма — сказаў ён — толькі праца з'яўляецца крыніцай росту дабрабыту працоўных. Сталінская Канстытуцыя забяспечвае ўсім працоўным усе багацці жыцця. Злачынная-ж сямейка Файнштэйнаў, пагарджаючы чэснай працай, пайшла на шлях бандытызма, і афярай іх з'явіўся высокаталенавіты мастак Пэн.

Далей дзяржаўны абвінаваўца даў характарыстыку кожнаму абвінавачваемаму і вызначыў ступень іх віноўнасці.

Пракурор патрэбаваў для галоўных абвінавачваемых — непасрэдных забойцаў Пэна — Абрама Файнштэйна — турэмнага зняволення тэрмінам на 10 год, Нэхі Файнштэйн — на 8 год, для натхніцеля забойства і абрабавання — Леі Файнштэйн — 10 год, саўдзельнікаў злачынства—Хаіма-Шлёмы Файнштэйна — 4 гады, Рывы Саламонік — 3 гады, Рувіма Файнштэйна — 3 гады і Залмана Файнштэйна — 1 год, а для Оліфсона Міхаіла і Саламоніка Мордуха — апраўдання.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ДЗЕННІК

— Даклад тав. Пуціцава «Аб задачах антырэлігійнай прапаганды» для дакладчыкаў, прапагандыстаў, агітатараў горада Менска адбудзецца 22 красавіка ў 7 гадзін вечара ў вялікай зале Дома партактыва. Білеты на ўваход атрымаць у горпайкомах КП(б)Б.

— Чарговыя заняткі семінара па гісторыі ВКП(б) парторгаў Кагановіцкага раёна адбудуцца ў памяшканні райпартгабінета (Дом урада, левае крыло, 5 пад'езд, пакой 501).

— Заняткі раённага гуртка па ленінізму адбудуцца 22 красавіка ў 8 гадзін вечара ў памяшканні Кагановіцкага РК КП(б)Б (пакой 501).

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 23 КРАСАВІКА:

8.30 — «Апошнія паведамленні». 17.00 — перадача для дзяцей. 18.30 — завочная партвучоба. 19.45 — песні народаў СССР 20.15 — канцэрт. 22.00 — эстрада і танцы. 23.00 — «Апошнія паведамленні». 23.15 — перадача на польскай мове.

МЕНСКАМУ ТРЭСТУ РЭСТАРАНАЎ І КАФЭ

патрэбны

ст. БУХГАЛТАРЫ, АФІЦЫЯНТЫ і АФІЦЫЯНТКІ.

ТАКСАМА АРГАНІЗУЮЦЦА

КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ АФІЦЫЯНТАЎ.

СЛУХАЧЫ ЗАБЯСПЕЧВАЮЦЦА СТЫПЕНДЫЯМІ.

Звяртацца: Рэволюцыйная, 2, тэл. 20-892, з 10 да 2 гадзін дня, аддзел кадраў.

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
22 красавіка Абан. № 90.
АПОШНІЯ

Памяшк. Дзяржаўнага Яўрэйск. тэатра | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА

КАРМЭН

Гукавы кінатэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» «БЕСПРИДАННИЦА»

Дзіцячы гукавы кінатэатр ПАКАЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

Гукавы кінатэатр «Пролетарый» НАЗАР СТАДОЛЯ

Гукавы кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» ЗАЛАТОЕ ВОЗЕРА

Гукавы кінатэатр «Спартак» ІЎДУШКА ГАЛАЎЛЁЎ

Інстытут масавага завочнага навучання партактыва пры ЦК КП(б)Б паведамляе, што праз радыёстанцыю імя Комінтэрна будуць перададзены наступныя лекцыі па курсу палітэканоміі:

27 красавіка ў 18 г. 30 м.

—„СУСВЕТНЫ ЭКАНАМІЧНЫ КРЫЗІС І СУЧАСНАЯ ДЭПРЭСІЯ АСОБАГА РОДУ".

(Аўтар лекцыі т. Варга).

29 красавіка ў 18 г. 30 м.

—„МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЕ ВУЧЭННЕ АБ ПЕРАХОДНЫМ ПЕРЫЯДУ АД КАПІТАЛІЗМА К КОМУНІЗМУ"

(Аўтар лекцыі т. Стэцкі).

Слухайце арганізавана ва ўсіх радыёпартаўдыторыях, партгабінетах і індывідуальна на дому.

Дырэктар ІМЗО пры ЦК КП(б)Б ЛУК'ЯНАЎ.

УВАГА! УВАГА!

Менская кантора БЕЛПРОМГАНДЛЯ ДЛЯ ЛЕПШАГА АБСЛУГОЎВАННЯ ПАКУПНІКОЎ У ПРАДСВЯТОЧНЫЯ ПЕРША МАЙСКІЯ ДНІ З 15 ДА 30 КРАСАВІКА

ПАВЯЛІЧЫЛА ГАДЗІНЫ ГАНДЛЮ

ПА УСІХ МАГАЗІНАХ НА 2 ГАДЗІНЫ.

УСЕ МАГАЗІНЫ ПА ЖАДАННЮ ПАКУПНІКОЎ ДАСТАЎЛЯЮЦЬ КУПЛЕНЫ ТАВАР НА ДОМ БЯСПЛАТНА. МАГАЗІНЫ ГАРАНТУЮЦЬ ЯКАСЦЬ ТАВАРАЎ.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Менскі піваварны завод „БЕЛАРУСЬ"
(Старажоўская, 44, тэл. 21-749 і 21-751)
выпускае ў продаж

ПІВА ВЫШЭЙШАЙ ЯКАСЦІ, ВЫРАБЛЯЕМАЕ З НАЙЛЕПШАЙ АДБОРНАЙ СЫРАВІНЫ ПА НОВАЙ, ЗАЦВЕРДЖАНАЙ НКМП БССР РЭЦЭПТУРЫ:

УКРАІНСКАЕ
ЖЫГУЛЕЎСКАЕ
РУСКАЕ
ПОРТЭР
ЧОРНАЕ

ВОДЫ ФРУКТОВА-ЯГАДНЫЯ НАПІТКІ З НАТУРАЛЬНЫХ СОКАЎ НА ЧЫСТЫМ ЦУКРУ, ПАВЫШАНАЙ ЯКАСЦІ:

КРЭМ-СОДА
ВІШНЕВЫ
ЛІМОННЫ
ТЗАТРАЛЬНЫ
МАЛІНАВЫ
КЛЮКВЕНЫ
КРУШОН
СІТРО
ХЛЕБНЫ КВАС
І МОРС
КЛЮКВЕНЫ ЯБЛАЧНЫ

ДА ВЕДАМА ГРАМАДЗЯН, ЯКІЯ ЗАХОЎВАЮЦЬ АБЛІГАЦЫІ

ДЗЯРЖАЎНЫХ ПАЗЫК У АШЧАДНЫХ КАСАХ

АШЧАДНЫЯ КАСЫ разаслалі трымальнікам, якія захоўваюць свае аблігацыі ранейшых пазык у ашчадкасах, паведамленні аб парадку і тэрмінах абмену гэтых аблігацый на аблігацыі пазыкі «Другой пяцігодкі» (выпуск чацвертага года) у сувязі з канверсіяй.

ЧАСТКА РАЗАСЛАНЫХ паведамленняў вернута назад у ашчадкасы за незнаходжаннем адрасатаў, бо ўладальнікі аблігацый пры пераездзе не паведамілі ашчадкасы аб сваім новым адрасе.

Кіраўніцтва ашчадкас і дзяржкрэдыта БССР напамінае:

АБМЕН АБЛІГАЦЫЙ РАНЕЙШЫХ ПАЗЫК, якія знаходзяцца на хаванні ў ашчадкасах, праводзіцца да 1 верасня 1937 г. пры асабістай яўцы ўладальніка або па яго пісьмовай заяве, з высылкай захоўна-ссуднага пасведчання.

ПАСЛЯ І ВЕРАСНЯ 1937 г. УСЕ НЕАБМЕНЕНЫЯ АБЛІГАЦЫІ РАНЕЙШЫХ ПАЗЫК ТРАЦЯЦЬ СВАЮ СІЛУ І АБМЕНЬВАЦЦА НЕ БУДУЦЬ.

25 МАЯ 1937 г. У МАСКВЕ АДБУДЗЕЦЦА ПЕРШЫ ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ ПАЗЫКІ «ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ» (выпуск чацвертага года). Трымальнікі, якія не абмянялі да гэтага тэрміну свае аблігацыі, не змогуць прымаць удзелу ў тыражы выйгрышаў.

ГРАМАДЗЯНАМ, якія захоўваюць свае аблігацыі ў ашчадкасах і перамянілі месцажыхарства, неабходна з'явіцца асабіста ў ашчадкасу або прыслаць заяву аб абмене аблігацый. У заяве трэба ўказаць: а) на якія аблігацыі пазыкі «Другой пяцігодкі» (выпуск чацвертага года) трымальнік жадае абмяняць аблігацыі ранейшых пазык і б) ці жадае трымальнік пакінуць аблігацыі пасля абмену на далейшае хаванне ў ашчаднай касе або патрабуе выслаць аблігацыі па новаму адрасу.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР.

БЕЛАРУСКІ ТРЭСТ ГАЛОЎХЛЕБ (Менск, Совецкая, 43/13)

ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ ДА ПЕРШАМАЙСКІХ СВЯТ ад устаноў, прадпрыемстваў, асобных раёнаў, сельпо і асоб З ДАСТАЎКАЙ

НА ВЫСОКАРЭЦЭПТУРНЫЯ ВЫРАБЫ:

ТАРТЫ, КЕКСЫ, ПІРОЖНЫЯ, СУХАРЫ, ПЯЧЭННЕ, і іншыя ЗДОБЫ і КАНДЫТАРСКІЯ ВЫРАБЫ

ВЫПУШЧАН ТАКСАМА СПЕЦЫЯЛЬНЫ ДЗІЦЯЧЫ АСАРТЫМЕНТ—

ТАРТЫ КЕКСЫ ПІРОЖНЫЯ

Фігурныя вырабы і розныя сатукі ПЯЧЭННЯ.

ЗАКАЗЫ прымаюць хлабазаводы: у Менску, Віцебску, Гомелі, Магілеве, Оршы, Барысаве, Бабруйску, Мазыры, Полацку, Жлобіне, Рэчыцы, Слуцку.

Таксама можна заказваць праз Галоўхлеб, тэлеграфам і па тэлефонах 23-646 і 24-492.

ГАТУНКОВАЕ НАСЕННЕ

ТРАЎ КАНЮШЫНЫ, КОРАНЬПЛОДАЎ, ГАРОДНЫХ КУЛЬТУР і КВЕТАК



МЕНСКАЯ БАЗА ДЗЯРЖСОРТФОНДА
(г. Менск, Козырава, Германаўская вуліца, дом № 1)

ПРАДАЕ праз свае ЛАРКІ

ПРОДАЖ праводзіцца без абмежаванняў УСІМ па дзяржаўных цэнах

У МЕНСКУ (на рынках — Крытым, Чэрвеньскім, пляцы 25 Кастрычніка, Суражскім і Конным базары),
У ВІЦЕБСКУ (Чырвонаармейская, 23) і
У ПОЛАЦКУ

АБ ЦЭНАХ на насенне можна даведацца таксама і па тэл. 20-972.

К ПРАДСТАЯЧАМУ НАЛГАСНАМУ КІРМАШУ — З 25 ПА 30 КРАСАВІКА ЛАРКІ ПАПАЎНЯЮЦЦА АСАРТЫМЕНТАМ УСЯГО НАСЕННЯ.

ДА ВЕДАМА НАСЕЛЬНІЦТВА

Для лепшага абслугоўвання пакупнікоў ДА НАДЫХОДЗЯЧЫХ СВЯТ 1 МАЯ

Менсаюзунівермаг і дзіцячы філіял

з 16 да 30 красавіка ПАВЯЛІЧЫЛІ ЧАС ГАНДЛЮ на 2 гадз.,

з. зн. з 10 г. раніцы да 9 г. 30 мін. вечара. (без выходных дзён)

ДЫРЭКЦЫЯ.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

Уп. Галоўлітбела № К—2068. Друкарня газеты «Звязда». Менск, Совецкая, 63. Б., К., С.